Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 121 (7003)

СУБОТА

24

МАЯ

1941 г.

ЦАНА 15 КАП.

Сёння ў нумары:

АБ ПРЫКЛАДНЫХ НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ НА МЕЛІЯРАТЫЎНЫХ РАБОТАХ У КАЛГАСАХ БССР І АБ МЕРАХ ЗААХВОЧВАННЯ ЗА ПЕРАВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ АСУШЭННЯ І АСВАЕННЯ БАЛОТ. —Пастанова Совета Народных Камісараў Беларускай ССР.

У Народным Камісарыяце Дзяржаўнага Кантролю Беларускай ССР.

Вывучайце замежныя мовы. (Перадавы артыкул «Правды» за 23 мая г. г.).

За датэрміновае выкананне поўгадовага плана.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

Х. Найман — Палітычная агітацыя на сяле.

Н. Альфер — Рабочы дзень прапагандыста райкома.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ. І. Сярэбраны — Няўдалыя вопыты.

АРТЫКУЛЫ:

Е. Уралава — Паспяхова правядзем іспыты ў школах.

С. Рудноўскі — Штодзённа кіраваць сяўбой.

А. Матусевіч — Марудзяць з сяўбой тэхнічных і кармавых культур.

З. Пішчалаў — Асушаем 320 гектараў балота.

ЗА РУБЯЖОМ:

Вайна ў Еўропе, Афрыцы і Азіі.

Вайна ў Кітаі.

Гандляваць культурна, па-совецку!

Наша партыя, яе вялікі правадыр і глава совецкага ўрада таварыш Сталін паспяшна клапоціцца аб росце добрабыту працоўных мас, аб усямерным задавальненні іх штодзённа растучых патрэб. Адным з важнейшых сродкаў абслугоўвання шырокіх мас насельніцтва з'яўляецца совецкі гандаль. Праз яго мільёны совецкіх грамадзян атрымліваюць усе рознастайныя тавары, якія ва ўсё большай і большай колькасці даюць социялістычная прамысловасць і сельская гаспадарка.

З кожным годам расце рознічны тавараабарот у нашай краіне. Багацце тавараў і прадуктаў шырокага спажывання, рост добрабыту працоўных ствараюць выключна спрыяючыя ўмовы для далейшага росквіту совецкага гандлю.

У нашай рэспубліцы рознічны тавараабарот па сетцы дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю (без грамадскага харчавання) павысіўся з 3.702 мільёнаў рублёў у 1939 г. да 5.069 мільёнаў рублёў у 1940 г. У I квартале гэтага года рознічны тавараабарот па БССР дасягнуў 1.405 мільёнаў рублёў, а ў красавіку ён перавысіў 480 мільёнаў.

З кожным годам павялічваецца гандлёвая сетка рэспублікі. На 1 студзеня 1940 г. налічвалася (па ўсходніх абласцях) 11.701 гандлёвая адзінка, а на 1 студзеня 1941 г. — 12.104.

Сотні тысяч рублёў расходуюцца на будаўніцтва новых гандлёвых прадпрыемстваў, на абсталяванне і рэканструкцыю існуючай сеткі. Гарады рэспублікі ўзбагаціліся выдатнымі, прыгожымі магазінамі, абсталяванымі паводле апошняга слова гандлёвай тэхнікі.

У прыведзеных намі лічбах яркa адлюстраваны поспехі совецкага гандлю, дасягненні ў справе палепшання абслугоўвання працоўных.

На 1941 год запланіраван рост тавараабароту па рэспубліцы звыш чым на 600 мільёнаў рублёў. Размер тавараабароту павінен дасягнуць велізарнай сумы — 5.700 мільёнаў рублёў.

Зусім ясна, што задача поўнага выканання плана патрабуе ад работнікаў гандлёвай сістэмы ўзорнай арганізацыі справы, вывучэння і задавальнення попыту спажыўцоў, настойлівай барацьбы за высокую якасць і рознастайны асартымент тавараў. Элементарнае патрабаванне совецкага культурнага гандлю — чыстата і парадак у гандлёвых прадпрыемствах. Выгляд іх павінен вабіць пакупнікоў, а не адштурхоўваць іх. Дырэктары, работнікі магазінаў павінны пастаянна сачыць за тым, каб вітрыны ўпрыгожвалі прадпрыемства, каб на паліцах і прылаўках быў заўсёды вялікі выбар тавараў, каб ва ўсіх кутках была ўзорная чыстата.

Совецкі гандаль мае на мэце, як абавязковую ўмову, —ветлівасць і культурнасць прадаўцоў. Абавязак работнікаў гандлю — вывучаць і ведаць запросы пакупнікоў, клапаціліва прапанаваць ім тавары, чутка прыслухоўвацца да іх патрабаванняў, даць магчымасць спажыўцу выбраць тавар па свайму густу і жаданню.

Аднак некаторыя гандлёвыя работнікі пагарджаюць асноўнымі правіламі совецкага гандлю, груба адносяцца да пакупніка, не турбуюцца аб чыстаце і парадку ў магазіне.

Праведзены нядаўна рэдакцыяй «Звязды» рэйд па магазінах Мінска ўскрыў непрыгледную карціну. У матэрыялах рэйда (гл. «Звязду» ад 22 мая) прыведзен рад фактаў грубых, некультурных адносін да пакупнікоў, фактаў антысанітарыі ў магазінах. На жаль, у нас нямала такіх прадаўшчыц, як Майсеева (кніжны магазін № 7), Гольдрэй (магазін № 212). Яны глядзяць на пакупніка, як на «абслугоўваемую адзінку», а не як на жывога чалавека. Яны забываюць аб сваім элементарным абавязку клапаціцца аб спажыўцу, лічаць увагу да пакупніка «непрыемнай нагрузкай».

У «Звязде» нядаўна быў надрукаван матэрыял аб парадках у магазіне «Гастраном» № 1 у Мінску. У гэтым выдатна абсталяваным магазіне, які павінен быць узорным гандлёвым прадпрыемствам, многія прадаўцы з'яўляюцца носьбітамі бескультур'я, самі насаджаюць антысанітарыю. Наведвальнік можа гадзінамі хадзіць па магазіну, спыняцца ля кожнага прылаўка—і ніхто не запытае яго, што яму патрэбна, чаго ён жадае. Прыклад абыякавых, пагарджлівых адносін да пакупнікоў паказвае дырэктар магазіна т. Парэнчык. Ён бюракратычна, па-казённаму рэагіруе на скаргі спажыўцоў. Па ім раўняюцца і астатнія работнікі магазіна.

У некаторых гандлёвых работнікаў праяўляецца «нэпманскі душок», не зжыты гандлярскія тэндэнцыі. Хіба не аб гэтым сведчаць факты абмерання, абважвання пакупнікоў, водпуску тавараў знаёмым па запісках, з «чорнага ходу», факты хавання прадуктаў пад прылаўкамі? Такія выпадкі мелі месца ў магазіне «Гастраном» № 1, у магазіне № 23 па Старажоўскай вуліцы (г. Мінск) і ў іншых.

Гандлярскія тэндэнцыі трэба выпальваць каленым жалезам, трэба гнаць з гандлёвага апарата жулікаў, зладзеяў, прайдзісветаў.

Матэрыялы аб рабоце раду магазінаў, змешчаныя ў «Звязде» патрабуюць хуткага і канкрэтнага рэагавання, дзейсных мер па ліквідацыі ўсіх выяўленых агідпасцей. На жаль, некаторыя гандлёвыя арганізацыі фармальна падышлі да гэтай справы, займаюцца толькі бюракратычнымі, нікчэмнымі адпіскамі.

Чаго варта, напрыклад, такое, з дазволу сказаць, рэагаванне Беларускай канторы «Гастраном» на апублікаваны 17 мая ў «Звязде» артыкул аб грубым нарушэнні прынцыпаў совецкага гандлю ў магазіне «Гастраном» № 1. Белкантора «Гастраном» ўстанавіла, што ўсе факты, прыведзеныя ў артыкуле, поўнасцю адпавядаюць сапраўднасці. Аднак, дырэктар канторы тав. Каган дзейсных мер не прыняў. У магазіне, па сутнасці, нічога не змянілася. Людзі, якія з'яўляюцца прамымі віноўнікамі ўсіх выяўленых агіднасцей, асталіся працаваць на сваіх месцах, нібы нічога не здарылася.

Безумоўна, такое «рэагаванне» не можа спрыяць навядзенню сапраўднага, большэвіцкага парадку ў гандлёвай сістэме, забяспечыць строгае захаванне прынцыпаў культурнага совецкага гандлю.

Трэба выхоўваць у масе гандлёвых работнікаў пачуццё адказнасці перад дзяржавай, чэсныя, добрасумленныя адносіны да даручанай ім справы.

Важнейшае значэнне набывае барацьба з бракам у гандлёвай сетцы. Многія магазіны не змагаюцца за якасць тавараў, прымаюць усё, што ім прапануюць прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі аптовага гандлю, не ствараюць заслоны супроць браку. У гэтым праяўляюцца бяздушныя, казённыя адносіны да спажыўца, ігнараванне яго запатрабаванняў і густу. У тых-жа матэрыялах рэйда фігуравалі цікавы выпадак з чаманданам, абклееным крэннымі абоямі, якія псавалі бялізну. Такі бракаваны чамадан спакойна прадавалі ў магазіне № 14 па Ленінскай вуліцы, прадавалі не чырванеючы перад пакупнікам.

А колькі ёсць выпадкаў, калі спажывец пакідае магазін, нічога не купіўшы, толькі таму, што якасць тавару нізкая, расцветка сумная, непрывабная.

Важнейшая задача партыйных арганізацый, прафсаюзаў работнікаў дзяржаўнага гандлю і кааперацыі—аддаваць максімум увагі распырэнню палітычнага кругазору і дзелавой кваліфікацыі работнікаў прылаўка, вучыць іх металам совецкага культурнага гандлю. Трэба шырока папулярызаваць узоры работы выдатнікаў гандлю. А іх нямала ў нашай рэспубліцы!

Кожны гандлёвы работнік павінен цвёрда памятаць указанне таварыша Сталіна ў дакладзе на XVII з'ездзе партыі аб тым, што

«... совецкі гандаль ёсць наша, родная, большэвіцкая справа, а работнікі гандлю, у тым ліку работнікі прылаўка, калі яны толькі працуюць чэсна,—з'яўляюцца праваднікамі нашай, рэволюцыйнай, большэвіцкай справы».

Добрасумленна выконваць абавязкі работніка совецкага гандлю—значыць з любоўю адносіцца да сваёй справы, аўладаць тэхнікай, паважаць пакупніка, адчуваць сваю адказнасць перад совецкім народам.

У апошнюю гадзіну

ДА СТАНОВІШЧА ФРАНЦУЗСКАГА ГАНДЛЁВАГА ФЛОТА

ЛОНДАН, 23 мая. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, французскі танкер «Шэхерэзада», які ішоў з грузам нафты з ЗША ў Касабланку, захвачан у Атлантычным акіяне англійскім ваенным караблём.

У англійскім міністэрстве эканамічнай вайны атрыманы весткі, што французскае марское міністэрства абавязала капітанаў французскіх гандлёвых суднаў тапіць або вывозіць са строю судны ў выпадку небяспекі папасці ў рукі англічан.

ШАНХАЙ, 23 мая. (ТАСС). Агенцтва Домей Цусін паведамляе, што ў сувязі з пагоршаннем франка-амерыканскіх адносін і каб упікнуць захвату ЗША французскіх суднаў на Філіпінах французскія параходы не будуць заходзіць у Манілу.

ФІНАНСАВАЕ СТАНОВІШЧА ФІНЛЯНДЫІ

ХЕЛЬСІНКІ, 23 мая. (ТАСС). У фінляндскім журнале «Эканамічнае жыццё» апублікаван артыкул міністра фінансаў Пекала, у якім гаворыцца, што дзяржаўны доўг Фінляндыі складае 18,5 мільярда марак. Бюджэт у мінулым годзе быў зведзен з дэфіцытам у 2,5 мільярда марак. Дэфіцыт да канца бягучага года дасягне 5—6 мільярдаў марак, а доўг павысіцца да 22—23 мільярдаў марак. Калі яшчэ ўлічыць расходы на пакрыццё ваенных страт, падкрэслівае Пекала, то доўг дасягне 35 мільярдаў марак, а, магчыма, і большай сумы.

ПЕРАГАВОРЫ АНГЛІІ З ЛАЦІНА-АМЕРЫКАНСКІМІ КРАІНАМІ

НЬЮ-ЙОРК. 23 мая. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англічане вядуць перагаворы з прадстаўнікамі лаціна-амерыканскіх краін аб закупцы больш 100 замежных параходаў, укрыўшыхся ў портах Лацінскай Амерыкі.

ЕГІПЕЦКІ КОНСУЛ У БЕЙРУЦЕ ПРАПАНАВАЎ ЕГІПЦЯНАМ ВЫЕХАЦЬ З СІРЫІ І ЛІВАНА

НЬЮ-ЙОРК. 23 мая. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, егіпецкі консул у Бейруце прапанаваў пражываючым у Сірыі і Ліване егіпцянам як мага хутчэй выехаць у Егіпет.

АБ ПРЫКЛАДНЫХ НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ НА МЕЛІЯРАТЫЎНЫХ РАБОТАХ У КАЛГАСАХ БССР І АБ МЕРАХ ЗААХВОЧВАННЯ ЗА ПЕРАВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ АСУШЭННЯ І АСВАЕННЯ БАЛОТ

Пастанова Совета Народных Камісараў Беларускай ССР

У мэтах больш паспяховага выканання планаў па асушэнню і асваенню балот, павышэння прадукцыйнасці працы, заахвочвання калгаснікаў і кіраўнікоў калгасаў за перавыкананне планаў, Совет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Рэкамендаваць калгасам, пачынаючы з 1941 года, кіравацца наступнымі прыкладнымі нормамі выпрацоўкі і адзельнымі расцэнкамі ў працадзнях на меліяратыўных работах:

ВІДЫ РАБОТ	Дзённая норма выпрацоўкі	Адзінка ў працаднях за дзённую норму
I. Пракладка ўручную магістральных каналаў другога парадку		
а) па тарфяному грунту	8—12 кбм.	2
б) па мінеральнаму грунту	5—8 »	2
II. Пракладка асушальнай сеткі (калектараў і асушальнікаў)		
а) па тарфяному грунту	10—14 кбм.	1,75
б) па мінеральнаму грунту	6—10 »	1,75
III. Рамонт магістральных каналаў		
а) капітальны рамонт	5—8 кбм.	2
б) бягучы рамонт	30—50 пат. м.	1,75
IV. Рамонт асушальнай сеткі		
а) капітальны рамонт	20—35 пат. м.	1,75
б) бягучы рамонт	50—70 »	1,50
V. Раскідванне кавальераў		
а) на асушыцелях	40—50 »	1,50
б) на калектарах	20—30 »	1,50
VI. Расчыстка, распарчоўка з раздзелкай драўніны і ўкладкай у штабелі і кучы.		
а) пры густым кустарніку і дробналессі	0,01—0,02 га	1,50
б) пры сярэднім кустарніку і дробналессі	0,03—0,05 »	1,50
в) пры рэдкім кустарніку і дробналессі	0,10—0,15 »	1,50
VII. Расчыстка кустарніка на прыродных лугах і пасбішчах		
а) пры густым кустарніку	0,02—0,04 »	1,50
б) пры сярэднім кустарніку	0,06—0,10 »	1,50
в) пры рэдкім кустарніку	0,20—0,30 »	1,50

2. Рэкамендаваць калгасам устанавіць наступную прагрэсіўную аплату працы калгаснікаў за перавыкананне прынятых у калгасе дзённых норм выпрацоўкі на меліяратыўных работах: за выкананне другой нормы налічваць працадні ў палутарным размеры, за трэцюю норму і вышэй—у двайным размеры.

Звяннявым за кіраўніцтва звяном налічваць дадаткова 20 проц. да агульнай колькасці выпрацаваных імі асабіста працадзён на меліяратыўных работах.

3. Для забеспячэння тэхнічнага і арганізацыйнага кіраўніцтва аграмеліяратыўнымі работамі ў калгасах лічыць неабходным у тых калгасах, дзе плошча асушэння і асваення балот складае больш 100 гектараў, мець у калгасе калгаснага аграмеліяратара.

4. Рэкамендаваць калгасам устанавіць аплату працы калгаснага аграмеліяратара на ўзроўні брыгадзіраў паляводчых брыгад.

За працягласць работы па аграмеліярацыі ў калгасе налічваць аграмеліяратару дадаткова: за трэці год работы—5 год, ад 50 да 80 гектараў—30 працадзён, ад 80 да 100 гектараў—40 працадзён, звыш 100 гектараў—50 працадзён.

Пры перавыкананні плана асушэння і асваення балот і забалочаных зямель, прынятага калгасам, налічваць старшыням калгасаў дадаткова наступную колькасць працадзён: пры перавыкананні плана асушэння і асваення балот і забалочаных зямель на 20 гектараў—15 працадзён, ад 20 да 50 гектараў—25 працадзён, ад 50 да 100 гектараў—40 працадзён, ад 100 і больш гектараў—50 працадзён.

7. Устанавіць для брыгадзіраў паляводчых брыгад, працуючых на меліяратыўных работах, наступныя заахвочванні:

За выкананне ўстаноўленага для брыгады плана асушэння і асваення балот і забалочаных зямель налічваць брыгадзіру: пры плане да 10 гектараў — 10 працадзён, пры плане ад 10 да 20 гектараў—20 працадзён, ад 20 да 30 гектараў—30 працадзён, звыш 30 гектараў—50 працадзён.

За перавыкананне ўстаноўленага для брыгады плана асушэння і асваення балот і забалочаных зямель налічваць брыгадзіру дадаткова наступную колькасць працадзён: пры перавыкананні плана на 5 гектараў—10 працадзён, ад 5 да 10 гектараў—20 працадзён, ад 10 да 20 гектараў—40 працадзён і звыш 20 гектараў—50 працадзён.

8. Устанавіць, што калгаснаму аграмеліяратару пры выкананні і перавыкананні плана асушэння і асваення балот і забалочаных зямель у цэлым па калгасу налічваюцца дадаткова працадні ў памеры 70 процантаў ад колькасці працадзён, налічаных за выкананне і перавыкананне плана старшыні калгаса.

9. Устанавіць для раённых інспектараў па меліярацыі і загадчыкаў райземаддзеламі прэміі за перавыкананне планаў па асушэнню і асваенню балот і забалочаных зямель у цэлым па раёну ў наступных памерах: пры перавыкананні плана ад 10 да 25 проц.—месячны аклад зарплаты, 26—50 проц—паўтарамесячны аклад зарплаты і звыш 50 проц.—двухмесячны аклад зарплаты.

10. Налічэнне дадатковай колькасці працадзён за выкананне і перавыкананне планаў асушэння і асваення балот і забалочаных зямель—старшыні калгаса, брыгадзірам і аграмеліяратару робіцца пры ўмове добрай якасці работы пасля прыёмкі работ прыёмачнай камісіяй.

11. Прапанаваць выканкомам Советаў дэпутатаў працоўных арганізаваць расстаноўку і зацвярджэнне калгасамі норм выпрацоўкі на меліяратыўныя работы, шырока раз'ясніць калгаснікам парадак заахвочвання за перавыкананне планаў асушкі і асваення балот і мабілізаваць калгаснікаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі на датэрміновае выкананне і перавыкананне ўстаноўленых планаў.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
І. Былінскі.

В. аб. Кіраўніка справамі Совета Народных Камісараў БССР **А. Фадзееў.**

ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАННЕ ПОЎГАДОВАГА ПЛАНА

20.000 скрынак запалак звыш плана

РЭЧЫЦА. (Па тэлефону). Калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік», абмеркаваўшы зварот калектыва завода імені Дзержынскага, узяў наступныя абавязацельствы:

поўгадавы план па выпуску запалак выканаць 14 чэрвеня і даць звыш плана 20.000 скрынак запалак; дабіцца эканоміі ад зніжэння сабекошту прадукцыі ў суме 150 тысяч рублёў; даць звышпланавых накапленняў у першым паўгоддзі ў суме 700 тысяч рублёў.

Залогам выканання гэтых абавязацельстваў з'яўляецца стахановская праца калектыва. План выпуску запалак фабрыка штодзённа выконвае на 105 процантаў. Перадавы аўтаматны цэх (начальнік тав. Лысенка, парторг тав. Папоў) дабіўся ліквідацыі прастояў і змяншэння адыходаў. У цэху няма ні аднаго рабочага, не выконваючага нормы выпрацоўкі.

Г. ШЭЙМАН, дырэктар фабрыкі.
ЧАРНЯЎСКІ, сакратар партбюро.

Абавязацельствы бабруйскіх харчавікоў

БАБРУЙСК. 23 мая. Работа па графіку прынесла многа вытворчых поспехаў калектыву бабруйскай кандытарскай фабрыкі «Чырвоны харчавік». Штодзённа план выконваецца на 113—115 проц. 23 мая фабрыка выканала 5-месячную вытворчую праграму на 107,2 проц. На фабрыцы значна знізіліся страты. Калі ў студзені яны дасягалі 2,69 проц., то ў красавіку—0,34 проц.

У адказ на заклік дзержынцаў, калектыў фабрыкі абавязаўся датэрмінова выканаць поўгадавую праграму да 11 чэрвеня.

Датэрмінова выканаў свой пяцімесячны план бабруйскі хлебакамбінат. Ён дабіўся накаплення ў суму ў 1.400 тыс. рублёў. Калектыў таксама абавязаўся выканаць датэрмінова поўгадавую праграму да 5 чэрвеня. (БЕЛТА).

На 50 тыс. рублёў прадукцыі звыш плана

БАРАНАВІЧЫ, 23 мая. (Кар. «Звязды»). У адказ на зварот дзержынцаў, рабочыя Баранавіцкай швейнай фабрыкі да 23 мая выканалі пяцімесячную вытворчую праграму на 108 процантаў. Выпушчана прадукцыі па суму 255 тыс. рублёў і зэканомлена 78 метраў верхняга матэрыяла. Фабрыка абавязалася да 5 чэрвеня поўнасцю выканаць поўгадавую вытворчую праграму і выпусціць звыш плана прадукцыі на 50.000 рублёў.

За 170 тысяч цаглін

Калектыў мінскага цагельнага завода № 1 за паспяховае выкананне вытворчай праграмы першага квартала гэтага года атрымаў пераходны чырвоны сцяг Наркамата прамысловасці будматэрыялаў і ЦК профсаюза і 5.000 рублёў для прэміравання лепшых стахановцаў.

У адказ на ўзнагароду, а таксама на заклік дзержынцаў, калектыў завода аднадушна рашыў выканаць поўгадавую праграму па ўсіх відах прадукцыі (уключаючы аператыўнае заданне) да 25 чэрвеня.

На ўсіх участках і ў цэхах завода шырока разгарнулася социялістычнае спаборніцтва за штодзённы выраб не менш 170 тыс. цаглін-сырцу.

Па Мінску і рэспубліцы

БЮДЖЭТ РАЁНА.

ВАЛКАВЫСК. Трэцяя сесія раённага Совета дэпутатаў працоўных зацвердзіла бюджэт раёна на 1941 год у суме 7.234.700 рублёў. Гэта лічба перакананўча сведчыць аб палепшанні матэрыяльнага дабрабыту працоўных, аб росце прамысловасці, культуры, аб развіцці социялістычнай сельскай гаспадаркі.

Паводле зацверджанага сесіяй народна-гаспадарчага плана, выпрацоўка цэглы ўзрасце на 26 процантаў, чарапіцы — на 33 проц., цэменту — на 20 проц., здабыча валны — на 100 проц.

Толькі на ахову здароўя працоўных горада Валкавыска на 1941 год асігнавана 1.276 тысяч рублёў, на народную асвету — 1.425 тыс. рублёў, у той час, як пры панаванні белапалякаў на гэтыя мерапрыемствы выдаткоўвалася 32 тысячы злотых.

На станцыі Гомель-пасажырскай. Адна з лепшых дзяжурных, Марыя Тарасаўна Аўдзеенка дае адпраўленне поезду № 90 на Днепрапетроўск. Фото А. Шаевіча. (БЕЛТА).

УДЗЕЛЬНІКІ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ ВЫЕХАЛІ Ў МАСКВУ

23 мая з Мінска ў Маскву выехала група перадавікоў сельскай гаспадаркі заходніх абласцей рэспублікі. Сярод іх — старшыня калгаса імені Леніна, Пінскага раёна, П. Р. Федаровіч, брыгадзір калгаса імені Сталіна, Глыбоцкага раёна, Е. Я. Мяшкоў, звяннявая калгаса імені Варашылава, Жабінкаўскага раёна, М. Ф. Байдоўская і іншыя.

На адкрыцці выстаўкі будзе прысутнічаць 66 перадавікоў социялістычнай сельскай гаспадаркі рэспублікі.

***

ГОМЕЛЬ. На адкрыцці сельскагаспадарчай выстаўкі з Гомеля ў Маскву выехала група перадавікоў сельскай гаспадаркі вобласці ў саставе 8 чалавек. Сярод іх — брыгадзір калгаса «Беларусь», Чачэрскага раёна, тав. Мачэча, брыгадзір па кок-сагызу з калгаса «Чырвоная Дуброва», Рагачоўскага раёна, тав. Бардуленка і іншыя. (БЕЛТА).

ЗБОР СНАЙПЕРАЎ

ЗахАВА. (Белта). Закончыўся збор начальнікаў снайперскіх каманд Заходняй Асобай ваеннай акругі. За месяц вучобы майстры меткага агню ўдасканалілі практычныя і тэарэтычныя веды, вывучылі методыку падрыхтоўкі снайпераў. Практычныя стрэльбы праводзіліся ў абстаноўцы, набліжанай да баявой.

Збор закончан паспяхова. Па агнявой справе і тактыцы слухачы атрымалі толькі добрыя і выдатныя ацэнкі. На двухдзённых спаборніцтвах лепшыя рэзультаты па стральбе паказаў малодшы лейтэнант Барысаў. Ён узнагароджан каштоўным падарункам. Камандаваннем таксама адзначаны выдатнікі спаборніцтваў, малодшыя лейтэнанты тт. Ястрэб, Іваноў, Салодкі, лейтэнанты тт. Ненахаў, Ананаў і інш.

Усім здаўшым іспыты прысвоена званне «снайпер». Загадам па акрузе яны ўзнагароджаны нагрудным значкам «Снайпер РСЧА».

НАВІНЫ КІНО

⊙ Мінская студыя кінохронікі прыступіла да здымкаў кароткаметражнага фільма аб асушэнні і асваенні балот у Беларускай ССР. Здымкі робяцца ў Васілевіцкім, Даманавіцкім і іншых раёнах Палескай і Пінскай абласцей. Будзе паказана стахановская праца знатных грабароў рэспублікі тт. Смаглюка, Брагінца і іншых, сістэматычна перавыконваючых нормы выпрацоўкі.

Фільм прызначан для саюзнага экрана і будзе закончан у канцы чэрвеня.

⊙ У другой палавіне чэрвеня студыя прыступае да здымкаў кароткаметражнага фільма пра здабычу торфу ў БССР. У карціне будзе паказана ўсебеларускае социялістычнае спаборніцтва перадавых торфзаводаў рэспублікі, работа буйнейшых заводаў — «Большэвіка» (Гомельскі раён), Асінторфа і іншых.

Іспыты ў Беластоцкай яўрэйскай НСШ № 30. Вучні 6-га класа за выкананнем пісьмовай работы па рускай мове. Дыктуе настаўніца С. Заблудоўская. Прысутнічае дырэктар школы М. Рубінштэйн. Фото А. Сапіра. (БЕЛТА).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАЛІТЫЧНАЯ АГІТАЦЫЯ НА СЯЛЕ

Рашэнні XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і аб асушэнні і асваенні балот у БССР з'яўляюцца стрыжнем усёй палітычна-масавай работы на сяле.

Перабудову агітацыйнай работы ў вёсцы мы пачалі з таго, што кіраўнікамі агіткалектываў выдзелілі 7 таварышоў—работнікаў РК КП(б)Б і выканкома райсавета.

На семінарах кіраўнікоў агіткалектываў і сакратароў партарганізацый, а ў сельсоветах —на семінарах агітатараў былі глыбока вывучаны рашэнні XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі і апошнія рашэнні партыі і ўрада па Беларускай ССР. Апрача таго быў прачытан рад лекцый на тэарэтычныя тэмы. Сакратар РК КП(б)Б тав. Жалезнякоў прачытаў лекцыю на тэму «Вучэнне Леніна—Сталіна аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі». Адначасова ён гаварыў аб перспектывах развіцця сельскай гаспадаркі нашага раёна. Аб падняцці ўраджайнасці кок-сагыза прачытаў лекцыю прафесар Горапкага сельскагаспадарчага інстытута тав. Грабеннікаў, аб міжнародным становішчы — лектар абкома КП(б)Б тав. Аксельрод. На семінарах таксама абменьваліся вопытам работы агітатараў.

Райком партыі і рад пярвічных парторганізацый займаюцца пытаннямі агітацыйна-масавай работы не ад выпадку да выпадку, а штодзённа, дабіваюцца быць у курсе, каб агітацыя была канкрэтная, звязаная з задачамі кожнага калгаса па падняццю ўраджайнасці і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, каб яна была наступальнай і дзейснай.

Вялікую дапамогу кіраўнікам агіткалектываў і агітатарам аказаў перапавы артыкул «Правды» ад 20 сакавіка «Большэвіцкая агітацыя за рашэнні XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі».

Агітатары, давёўшы да сазнання калгаснікаў рашэнні партыі і ўрада аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі, мабілізавалі іх на захаванне маладняка. Асабліва вялікую работу ў гэтай галіне правялі парторганізацыі і агітатары Антонаўскага, Усушскага і Галавенчыцкага сельсоветаў.

Рэзультаты быстра сказаліся. За апошні год абсалютна спыніліся выпадкі ўбою маладняка. Меўшыя месца адзінкавыя выпадкі продажу цялят на старану асобнымі калгаснікамі Благовіцкага, Мажрадскага і Холмаўскага сельсоветаў былі неадкладна абмеркаваны на калгасных сходах. Па раёну ў цэлым план кантрактацыі цялят перавыкананы больш чым на 75 процантаў.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў з'явілася магнейшым сродкам арганізацыі калгасных мас па барацьбу за высокі ўраджай і прадуктыўнасць грамадскай жывёлагадоўлі.

Парторганізацыі і агітатары Антонаўскага, Валкавіцкага, Дужэўскага і Галавенчыцкага сельсоветаў не абмежаваліся абмеркаваннем гэтага гістарычнага рашэння толькі на сходах калгаснікаў, яны прадоўжылі гэту работу ў брыгадах і звеннях.

Брыгадзір калгаса «Чырвоная зорка», Антонаўскага сельсавета, кандыдат партыі тав. Багачэнка Пётр — лепшы агітатар у раёне. Ён не толькі дэтальна растлумачыў членам сваёй брыгады пастанову партыі і ўрада, але адразу ўзяўся за яе рэалізацыю. Тав. Багачэнка выклікаў на соцспаборніцтва брыгадыра першай брыгады тав. Бандаткова на атрыманне ў 1941 годзе ўраджаю жыта 14 цнт. з гектара, яравой пшаніцы — 12 цнт., ячменю — 11.8, бульбы — 150 цнт. Шырока разгарнулася соцспаборніцтва і паміж звеннямі.

Вялікую ролю ў агітацыйнай рабоце ў Антонаўскім, Галавенчыцкім, Валкавіцкім, Дужэўскім і іншых сельсоветах адыгрывае калгасны пізавы друк. У раёне выходзіць 130 калгасных насценных газет і 250 брыгадных лісткоў «За высокі ўраджай».

Пачынае разгортвацца масавая агітацыя і на меліяратыўных участках. РК КП(б)Б вызваліў 7 палітрукоў з ліку адказных партыйных работнікаў. Арганізавана 10 лекцыёнаў. На меліяратыўных участках працуе 35 агітатараў, ёсць кіноперасоўка.

Калгаснікі абавязаліся ў 1941 г. асушыць 851 гектар балот замест прадугледжаных планам 220 гектараў. Стахановцы-грабары паказваюць узоры высокай прадукцыйнасці працы. Брыгадзір меліяратыўнай брыгады тав. Шаперка Захар у мінулым годзе выкідваў 25 кубаметраў торфмасы. У гэтым годзе ён у першы дзень работы выкінуў 15 кубаметраў, у другі — 23 кубаметры, у трэці — 38 кубаметраў. 15 мая тав. Шаперка выкінуў 42 кубаметры торфмасы.

Усяго ў раёне ёсць 26 агітколектываў, у якіх аб'яднаны 563 агітатары. З іх камуністаў 98 чалавек, комсамольцаў 113. Сярод агітатараў—119 чалавек з калгаснага актыва, 338 настаўнікаў.

Нельга, аднак, сказаць што ўсе парторганізацыі сельсоветаў сур'ёзна займаюцца арганізацыяй палітычнай агітацыі. Некаторыя сакратары парторганізацый павярхоўна кіруюць палітычна-масавай работай і слаба арганізуюць калгаснікаў на выкананне рашэнняў партыі і ўрада. Да іх ліку належаць тт. Жыткевіч — сакратар парторганізацыі Мажрадскага сельсавета, Сурэмкін — кіраўнік агіткалектыва Хацьковіцкага сельсавета.

Х. Н. НАЙМАН,
заг. аддзела прапаганды і агітацыі Чаускага РК КП(б)Б.

Рабочы дзень прапагандыста райкома

Апісваемы намі дзень работы прапагандыста Варашылаўскага горкома КП(б)Б (Мінск) т. Корзун узят не на выбару. Гэта самы звычайны будні дзень прапагандыста.

У 9 гадзін раніцы ўсе работнікі аддзела прапаганды і агітацыі райкома, як і заўсёды, сабраліся да загадчыка аддзела тав. Лабецкага на так званую пяцімінутную нараду. Кожны далажыў, чым ён сёння будзе займацца, дзе будзе працаваць.

Прапагандыст т. Корзун паведаміла, што, згодна свайго дзённага графіка, складзенага на падставе двухмесячнага плана работы, у 10 гадзін раніцы яна павінна быць на швейнай фабрыцы «КІМ», дзе азнаёміцца са становішчам вытворчай прапаганды. У другой палавіне рабочага дня будзе рыхтавацца да правядзення чарговага тэарэтычнага субяседвання ў парторганізацыі трамвайнага парка.

Атрымаўшы згоду ў загадчыка аддзела, т. Корзун накіравалася на фабрыку.

План сваёй работы т. Корзун заўсёды складае, выходзячы з планаў работы аддзела прапаганды і агітацыі райкома і задач, якія на даны час ставіць райком партыі.

На бліжэйшы час планам райкома прадугледжана заслухаць даклад сакратара парторганізацыі фабрыкі «КІМ» аб становішчы вытворчай прапаганды і агітацыі на прадпрыемстве. Прапагандыст т. Корзун павінна выступіць у якасці сакладчыка. Таму яна ўжо трэці раз ідзе на фабрыку, падрабязна вывучае становішча спраў. На гэты раз ёй не прышлося, як заўсёды, дарэмна траціць часу на чаканне сакратара, на пошукі патрэбных людзей. Яе прыход на фабрыку не быў нечаканым. Аб усім гэтым было дагаворана загадзя. Тав. Корзун пагутарыла з сакратаром парторганізацыі, з дырэктарам фабрыкі, пабывала ў час абедзенага перапынку ў пашывачным цэху на гутарцы аб тэхнічнай вучобе. Затым падрабязна азнаёмілася з пратаколамі і рашэннямі парторганізацыі аб становішчы эканамічнай асветы, аб вытворчай прапагандзе і агітацыі траверыла, якія пытанні абмяркоўваліся на пасяджэннях партбюро і партыйных сходах і як яны выконваюцца. Адначасова т. Корзун зрабіла свае заўвагі аб недахопах у рабоце.

У час прабывання на фабрыцы яна не абышла і іншых важнейшых пытанняў жыцця вытворчасці. Тав Корзун цікавілася выкананнем вытворчага плана, работай па графіку Сакратар парторганізацыі тав Хайтман звярнулася да прапагандыста за парадай, як лепш пабудаваць аклад на пасяджэнні бюро райкома, на якіх пытаннях спыніцца больш падрабязна. Гутарылі таксама аб асобных рабочых, якія сістэматычна не выконваюць нормы выпрацоўкі, і радзе іншых пытанняў з жыцця фабрыкі.

З насценнай газеты і сігналаў асобных работніц тав. Корзун даведалася, што на фабрыцы не ўсё добра з улікам выпрацоўкі рабочых. Яна зацікавілася гэтым пытаннем глыбей, пагутарыла аб ім з сакратаром партыйнай арганізацыі і дырэктарам фабрыкі. У выніку выявілася, што загадчыца разліковага стала часта няправільна ўлічвала працу многіх рабочых, чым выклікала з іх боку справядлівыя нараканні. У бліжэйшы час будзе назначан другі загадчык разліковага стала.

У райком партыі т. Корзун прыбыла ў 3 гадзіны дня. Яна прадумала план складання справаздачы аб праробленай рабоце і ўзялася за падрыхтоўку да тэарэтычнага субяседвання якое яна павінна праводзіць. Хоць канспект і патрэбныя матэрыялы да VIII раздзела «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» былі ўжо гатовы, але яна рашыла асвяжыць усё ў памяці. Зноў прачытала ў ленінскім двухтомніку артыкулы аб VIII з'ездзе партыі, пераглядзела канспект, успамінала мастацкую літаратуру, прысвечаную таму часу, рашыла абавязкова спыніць увагу ўдзельнікаў субяседвання на аповесці А. Талстога «Хлеб», дзе ярка асвятляецца барацьба таварыша Сталіна за Царыцын, за хлеб, за Совецкую ўладу.

У гэты час некалькі разоў раздаваліся тэлефонныя званкі. Звярталіся з пярвічных парторганізацый, прасілі забяспечыць білетамі на лекцыю аб міжнародным становішчы Прыходзіў сакратар партыйнай арганізацыі фабрыкі «8 сакавіка» тав Эпштэйн. Ён настойліва прасіў, каб т. Корзун прысутнічала ў іх партарганізацыі на тэарэтычным субяседванні па 11 разделу Кароткага курса. У 17 гадзін зайшоў сакратар партыйнай арганізацыі ПЭЦ т. Шаршунскі. Ён прасіў т. Корзун у бліжэйшы час прыйсці да іх і дапамагчы ўстанавіць форму партыйнай вучобы, бо парторганізацыя ў сваім саставе за апошні час значна змянілася.

Калі канчыўся рабочы дзень, тав. Корзун накіравалася на сход сваёй партыйнай арганізацыі.

Тав. Корзун цікавіцца жыццём вытворчых партыйных арганізацый, вывучае яго, ускрывае недахопы ў рабоце і дапамагае іх выправіць, а гэта — самае галоўнае ў рабоце прапагандыста. Знаёмячыся з партыйным пратаколам, т. Корзун цікавіцца не толькі знешнім выглядам яго, не толькі яго афармленнем, але, і яго зместам, пастаноўкай пытанняў і выкананнем іх.

У работу парторганізацыі прадпрыемстваў тав. Корзун уваходзіць глыбока і па сутнасці, што можна толькі пажадаць многім работнікам аддзелаў прапаганды і агітацыі райкомаў.

Н. АЛЬФЕР.

Хроніка выбараў па рэспубліцы

Да 20 мая справаздачна-выбарныя сходы адбыліся ў 5.036 пярвічных арганізацыях КП(б)Б Справаздачы і выбары закончыліся ў Баранавіцкай, Брэсцкай, Віцебскай Пінскай, Палескай абласцях. У бліжэйшыя дні справаздачна-выбарная кампанія заканчваецца ва ўсіх астатніх абласцях рэспублікі.

Справаздачна-выбарныя сходы праходзяць арганізавана, пры высокай актыўнасці комуністаў. У спрэчках па дакладах бюро і сакратароў (там, дзе няма бюро) партарганізацый выступіла 63 процанты прысутнічаўшых на сходах.

Работа 381 сакратара і бюро партарганізацый за справаздачны перыяд прызнана нездавальняючай. Упершыню выбраны сакратарамі партарганізацый 1.610 чалавек.

У НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Наркамат Дзяржаўнага Кантролю Беларускай ССР праверыў становішча хавання, уліку і расходавання грашовых сродкаў і бланкаў строгай справаздачнасці ва ўпраўленнях і канторах мясцовых рынкаў у Мінску, Віцебску, Магілеве і іншых гарадах БССР.

I.

Ва ўпраўленні мясцовых рынкаў г. Мінска дырэктарам Гурвічам І. М., галоўным бухгалтарам Монусавым І. М. і касірам Кожэдубам В. І. быў злачынна нарушан устаноўлены парадак, па якому аперацыі з бланкамі строгай справаздачнасці—квітанцыямі разавага збору і аплаты за паслугі — павінны дакументыравацца і ўлічвацца з такой-жа строгасцю, як з наяўнымі грашыма. Улік бланкаў, у злачынных мэтах, быў заблытан. Кніга ўліку бланкаў квітанцый касірам не вялася; штомесячных праверак іх наяўнасці ў касе не рабілася: бланкі нумераваліся і захоўваліся ў прыватнай асобы, у абарачэнне былі выпушчаны квітанцыі незацверджанага ўзору, без указання іх вартасці, якія нідзе не ўлічваліся і выдаваліся работнікам рынкаў без распісак.

Галоўны бухгалтар Монусаў І. М склаў фіктыўную галаву справаздачу за 1940 г., уключыўшы ў яе няправільныя даныя і вывеўшы астатак бланкаў строгай справаздачнасці на 27.135 руб. менш, чым павінна было быць па фактычнаму прыходу і расходу.

Рэвізіяй касы ўпраўлення рынкаў выяўлена, што за час з 1 студзеня 1940 года па 1 сакавіка 1941 года з паступіўшых у касу упраўлення рынкаў сум выручкі за аказаныя паслугі Монусавым І. М. і Кожэдубам В. І. прысвоена 74.508 руб. 83 кап. Апрача таго, у касе аказалася нястача бланкаў строгай справаздачнасці на суму 19.568 руб. 30 кап. Пры праверцы касавых дакументаў выяўлены шматлікія падробкі і падчысткі іх, а частка дакументаў зусім знішчана.

Гурвічам І. М. і Монусавым І. М. нарушалася фінансава-каштарысная дысцыпліна. За 1940 год ва ўпраўленні рынкаў выплачана 40.180 руб. 03 кап. звыш зацверджаных ставак і штатаў, па няправільных сумяшчэннях, па так званых працоўных пагадненнях з прыватнымі асобамі і ў сувязі з іншымі незаконнымі расходамі, чым нарушаны пастановы СНК СССР ад 3 снежня 1932 г. № 1788, ад 11 сакавіка 1933 г. № 447, ад 13 мая 1935 г. № 895 і ад 15 жніўня 1939 г. № 1214 аб расходаванні фондаў зарплаты, штатнай дысцыпліне і аб парадку аплаты працы па сумяшчэнню.

Гурвіч І. М., як дырэктар упраўлення рынкаў, халатна адносіўся да сваіх службовых абавязкаў. У рэзультаце яго бязгаспадарнасці былі створаны ўмовы для раскрадання дзяржаўных сродкаў.

На аснове выяўленых праверкай фактаў Народны Камісар Дзяржаўнага Кантролю Беларускай ССР тав. Валошын зняў з займаемых пасад і прыцягнуў да судовай адказнасці дырэктара ўпраўлення рынкаў г. Мінска Гурвіча І. М., галоўнага бухгалтара гэтага-ж упраўлення Монусава І. М. і касіра ўпраўлення Кожэдуба В. І.

II.

Пры рэвізіі ўпраўлення мясцовых рынкаў г. Віцебска ўстаноўлена, што дырэктар упраўлення Пухавіцкі С. Х. і галоўны бухгалтар Воранаў С. Я. злачынна заблыталі ўлік бланкаў строгай справаздачнасці. Рэвізіяй выяўлена нястача квітанцый разавага збору на суму 81.735 руб. 85 кап. Пры згатаўленні бланкаў сума платы на іх друкарскім спосабам не друкавалася; бесперапыннасць нумерацыі не захоўвалася. Бланкі, атрыманыя Воранавым С. Я. з друкарні, не актываваліся і інвентарызацыя іх наяўнасці не рабілася, запас бланкаў не хаваўся ва ўстаноўленым парадку і яны каму-небудзь у пад справаздачу ім перададзены не былі.

Пухавіцкім С. Х. і Воралавым С. Я. груба нарушалася фінансава-каштарысная дысцыпліна. У 1940 годзе выплачана звыш устаноўленых ставак, па няправільных сумяшчэннях і ў сувязі з іншымі незаконнымі расходамі, — 32.098 руб. 56 кап. дзяржаўных сродкаў, чым нарушаны пастановы СНК СССР ад 3 снежня 1932 года № 1788, ад 11 сакавіка 1933 г. № 447 і ад 13 мая 1935 г. № 895.

Бухгалтарскі ўлік Воранавым С. Я. злачынна заблытан, матэрыяльныя каштоўнасці спісваліся ў расход па недагрунтаваных дакументах. Галавая справаздача за 1940 год не сходзіцца з аналітычным улікам і з'яўляецца фіктыўнай.

Рэвізіяй таксама ўстаноўлена, што заг. Віцебскага горфінаддзела Левін Г. А. самаўхіліўся ад кантролю за дзейнасцю мясцовых рынкаў і не выканаў указанняў Наркамфіна СССР аб штомесячных праверках стану ўліку і расходавання бланкаў строгай справаздачнасці.

Нарком Дзяржаўнага Кантролю Беларускай ССР зняў з займаемых пасад і прыцягнуў да судовай адказнасці дырэктара ўпраўлення рынкамі г. Віцебска Пухавіцкага С. Х. і галоўнага бухгалтара гэтага-ж упраўлення Воранава С. Я., заг. Віцебскага горфінаддзела Левіну Г. А. аб'яўлена вымова.

III.

Рэвізіяй упраўлення мясцовых рынкаў г. Магілева ўстаноўлена, што былы галоўны бухгалтар упраўлення Кучынскі П. М. склаў фальшывыя разлікі і дакументы і спісаў па іх у расход касы ўпраўлення рынкаў бланкі строгай справаздачнасці — квітанцыі разавага збору і аплаты за паслугі, — на суму 3.734 руб. 20 кап., у выніку чаго окрыта нястача бланкаў у касіра ўпраўлення рынкаў Корбута Д. Б.

Кучынскім П. М. было дапушчана спагнанне на рынках платы за хаванне прадуктаў без выдачы квітанцый устаноўленага ўзору. Узамен іх выдаваліся квітанцыі, выпісаныя ад-рукі на звычайнай блакнотнай паперы.

Наперакор устаноўленым правілам уліку, на паступаўшыя ва ўпраўленне рынкаў бланкаў строгай справаздачнасці, акты прыёмкі не складаліся, прыходна-расходная кніга не вялася, штомесячных праверак наяўнасці касы не рабілася, ліміты выдач бланкаў зборшчыкам устаноўлены не былі. Кучынскі П. М. дапусціў нарушэнне фінансавай дысцыпліны, у сувязі з чым незаконна зрасходавана 15.153 руб. дзяржаўных сродкаў.

Нарком Дзяржкантролю БССР прыцягнуў да судовай адказнасці былога галоўнага бухгалтара ўпраўлення мясцовых рынкаў г. Магілева Кучынскага П. М. Касір гэтага-ж упраўлення Корбут Д. Б. знят з займаемай пасады і таксама прыцягнут да судовай адказнасці.

IV.

Аддзел арганізацыі ганцлю Наркомгандлю БССР, гарадскія і раённыя аддзелы гандлю не кантраліравалі правільнасць згатаўлення, хавання, расходавання бланкаў строгай справаздачнасці і не арганізавалі іх уліку.

Намеснік начальніка аддзела арганізацыі ганцлю Наркомгандлю БССР Рыбакоў І. Н. безадказна адносіўся да выканання ўскладзеных на яго абавязкаў па арганізацыі кантролю за дзейнасцю мясцовых рынкаў. На працягу 1940 — 1941 гг. ім ні разу не было праверана выкананне ўпраўленнямі мясцовых рынкаў і Горгандальаддзелам інструкцыі Наркомгандлю СССР аб парадку вырабу, хавання і ўліку квіткоў па спагнанню разавага збору і платы за аказваемыя рынкамі паслугі. У нарушэнне правіл уліку Рыбакоў І. Н. дазволіў выпуск ў абарачэнне квіткоў адвольнага ўзору.

Мінскі гарадскі галёвы аддзел у нарушэнне ўстаноўленых Наркомгандлем СССР правіл не толькі не ажыццяўляў кантролю за хаваннем і ўлікам бланкаў строгай справаздачнасці ў упраўленні рынкаў г. Мінска, але нават перадаручыў апошняму іх згатаўленне.

Выконваючы абавязкі загадчыка Мінскім горгандальаддзелам Хентаў Я. А., не разгледваючы і не правяраючы прадстаўленай упраўленнем рынкаў г. Мінска справаздачы за 1940 год, склаў пратакол аб яе зацвярджэнні; справаздача гэта аказалася фіктыўнай.

Старшы інспектар Мінскага горгандальаддзела Зеленкевіч В. І. абавязаны правяраць дзейнасць рынкаў, бязгзейнічаў і, больш таго, незаконна атрымаў грашовыя ўзнагароды і будаўнічыя матэрыялы ў упраўленні рынкаў для будаўніцтва свайго дома.

У Магілеўскім горгандальаддзеле ўлік і хаванне бланкаў строгай справаздачнасці, што выконвала інспектар горгандальаддзела Васілёнак П. І., аказаліся ў беспарадачным стане. Васілёнак П. І. падпісала складзены былым галоўным бухгалтарам упраўлення рынкаў г. Магілева Кучынскім П. М. фіктыўны акт на спісанне бланкаў строгай справаздачнасці на суму 1.500 рублёў, у самой Васілёнак П. І. аказалася ў нястачы бланкаў на 388 руб. 47 кап.

Горгандальаддзелы Віцебска і Магілева ў 1940 годзе не зрабілі ні адной праверкі правільнасці хавання і ўліку бланкаў строгай справаздачнасці ў падведамственных ім упраўленнях рынкаў.

На аснове выяўленых фактаў Народны Камісар Дзяржаўнага Кантролю Беларускай ССР тав. Валошын зняў з займаемых пасад старшага інспектара Мінскага горгандальаддзела Зеленкевіча В. І. і інспектара Магілеўскага горгандальаддзела Васілёнак П. І. Намесніку начальніка аддзела арганізацыі ганцлю Наркомгандлю БССР Рыбакову І. Н. аб'яўлена строгая вымова. Выконваючаму абавязкі загадчыка Мінскага горгандальаддзела Хентаву Я. А. аб'яўлена вымова.

(БЕЛТА).



Лепшы стахановец-стругальшчык падсобнага цэха Мінскага вагонарамонтнага дэпо Д. К. Зубчонак, які выконвае штодзённа норму на 425—480 процантаў.

Фото С. Вальфсона. (БЕЛТА).

Усебеларускае спаборніцтва тарфянікаў

НА ТОРФЗАВОДЗЕ „ТАТАРКА"

АСІПАВІЧЫ, 23 мая. (Спец. кар. «Звязды»). На торфзаводзе «Татарка» з кожным днём расце колькасць брыгад, якія перавыконваюць план здабычы торфу. Змагаючыся за першынства ва ўсебеларускім сацыялістычным спаборніцтве тарфянікаў, адна брыгада стараецца апярэдзіць другую. 20 мая брыгада тав. Лашкарова перагнала брыгаду тав. Петрушэні: яна здабыла за змену 70.000 торфацаглін, устанавіўшы новы рэкорд на заводзе. Брыгада тав. Петрушэні змагаецца за тое, каб перакрыць гэты рэкорд.

Высокіх паказальнікаў дабілася брыгада тав. Лапуцька. Яна здабывае за змену 58.000 торфацаглін пры норме ў 38.000. Ад яе не адстае брыгада тав. Дзергаўзі.

Па-стаханаўску працуе брыгада тав. Дзенісевіча; на элеватарнай машыне яна дае штодзённа 58.000 торфацаглін, пры норме ў 35.000.

Не гледзячы на вышатную работу перадавікоў, торфзавод не выконвае сваіх сутачных заданняў па здабычы торфу. Асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца тое, што яшчэ не ўкамплектаваны ўсе брыгады.

Спаборніцтва брыгад

ВІЦЕБСК 23 мая. (Па тэлефону). Уключыўшыся ва ўсебеларускае спаборніцтва тарфянікаў, рабочы калектыў торфзавода «1-е мая» (Чашніцкі раён) паказвае ўзоры высокай прадукцыйнасці працы. Стаханаўская брыгада тав. Бугача, спаборнічаючы з брыгадай тав. Лейчанкі, штодзённа, пры норме ў 35.500 торфацаглін, здабывае па 37—38 тысяч. Стаханавец гэтай брыгады тав. Каспянка сістэматычна выконвае па 2 нормы: ён рассцілае па 14 тыс. торфацаглін за змену, пры норме ў 7.000. На 170 проц. выконвае сваё заданне па рассцілу торфу тав. Падрэз.

Не адстае ад брыгады тав. Бугача і брыгада тав. Лейчанкі; яна штодзённа дае па 32.600 торфацаглін, замест 25.500 па плану.

Калектыў торфзавода паставіў перад сабой задачу—выканаць сезонны план здабычы торфу на 110 процантаў і да 25 верасня поўнасцю высушыць і заштабеляваць увесь здабыты торф.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ТОРФЗАВОДАМІ ГАЛОЎТОРФА НАРКАМАТА МЯСЦОВАЙ ПАЛІЎНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР ЗА 23 МАЯ 1941 ГОДА
(у процантах)

ЗАВОДЫ	Сутачнае заданне	Календарнае заданне
Чырвоны сцяг	88,2	69,6
Ім. Орджанікідзе	15,2	36,6
Ім. Даумана	86,5	63,0
Дукора	89,6	77,4
Радзічава	76,4	63.0
Міханавічы	100,4	77.3
Балбасава	86,7	109.4
Зміёўка	81,1	86,6
Свабода	62,0	46,0
Лукскае	110.8	101,9
Татарка	97.7	77,9
Новая Беларусь	79,0	75,0
Давыдаўка	114,0	61,0
Хвойны Масток	108,7	109,9
Гуголица	70,4	50,3
Усяго	78,4	71,2
Асінторф	68,1	77,6

Вывучайце замежныя мовы

Усебаковы культурны ўздым прапоўных нашай краіны — адна з важнейшых умоў пабудовы комуністычнага грамадства. Совецкім людзям, творцам новага жыцця, трэба яснапытна рухаць наперад навуковую і тэхнічную мысль, трэба авалодваць усімі багаццямі сусветнай культуры. У гэтай вялікай творчай рабоце буйнае значэнне набывае веданне замежных моў, бо «мова — зброя развіцця і барацьбы». (Сталін).

Гэтай зброяй, якая ў дарэволюцыйнай Расіі была даступна толькі маёмным класам, у совецкай краіне ўладаюць многія тысячы людзей самых рознастайных прафесій. Яны вывучаюць замежныя мовы, каб яснапытна ўдасканальваць свае веды сваё майстэрства і тым самым прынесці больш карысці сацыялістычнай дзяржаве. Інжынеру замежная мова дае магчымасць пастаянна быць у курсе навейшых тэхнічных дасягненняў галоўных капіталістычных краін. Камандзіру Чырвонай Арміі або Ваенна-Марскога Флота яна дапамагае вывучаць вопыт сучасных войн, сачыць за зарубежнай ваеннай мыслью. Веданне замежных моў неабходна работнікам мастацтва і навукі, яно прынясе велізарную карысць любому педагогу, урачу, аграному, журналісту, любому спецыялісту, на якім-бы ўчастку ён ні працаваў.

У клопатах аб яснапытным павышэнні культурнага ўзроўню совецкіх грамадзян наша дзяржава прымае меры, каб замежныя мовы сталі здабыткам самых шырокіх мас. Мовы выкладаюць у сярэдняй школе ВНУ. ВТНУ ваенна-навучальных установах. Спецыяльныя педагагічныя і настаўніцкія інстытуты рыхтуюць выкладчыкаў замежных моў. Шырокае распаўсюджанне маюць розныя формы самаадукацыі ў відзе завочнага абучэння, курсаў без адрыву ад вытворчасці, гурткоў і т. д.

Вялікую ролю адыграла прынятая восенню мінулага года пастанова Соўнаркома Саюза аб выкладанні замежных моў у сярэдняй і вышэйшай школе. Яна падкрэсліла, што замежныя мовы павінны вывучацца гэтак-жа глыбока і сур'ёзна, як іншыя вучэбныя дысцыпліны.

Арганізацыя за апошні час у радзе ВНУ канферэнцый, дакладаў, вечароў мастацкай самадзейнасці на замежных мовах — сведчанне таго, што ў гэтай галіне намеціўся пэўны пералом. У «Правде» нядаўна паведамлялася аб навуковай канферэнцыі па біялагічным факультэце Горкаўскага універсітэта, дзе студэнт Карсакаў зрабіў на англійскай мове даклад аб гісторыі развіцця цыркуляцыі крыві, студэнт Анісімаў выступіў з дакладам па нямецкай мове аб фізіялогіі раслін і газаўстойлівасці і т. д. Некаторыя выпускнікі ваенных акадэмій абаранялі ў гэтым годзе на замежных мовах свае праекты. Так, напрыклад, у Артылерыйскай акадэміі імені Дзержынскага тав. Канель абараніў работу па нямецкай, тав. Паражнікоў — на англійскай мове. На ваенным факультэце Маскоўскага інстытута інжынераў сувязі нядаўна выпушчан нумар насценнай газеты на нямецкай, англійскай і французскай мовах.

Аднак гаварыць аб вялікіх поспехах пакуль яшчэ дачасна. Несур'ёзныя адносіны да выкладання моў у сярэдняй школе, лібералізм, праяўляемы педагогамі пры ацэнцы ведаў вучня, выпадкі очкаўпірацельства — ўсё гэта прыводзіць да таго, што нават выпатнікі, прымаемыя ў ВНУ без экзаменаў, слаба ведаюць замежныя мовы. Па сутнасці ВНУ прыходзіцца вучыць студэнтаў таму, што яны павінны былі атрымаць у сярэдняй школе. Студэнты часта не маюць ніякіх разгаворных навыкаў, не ўмеюць бегла чытаць замежны тэкст. Вучоба нярэдка пачынаецца з азоў.

Далёка не ўсе выкладчыкі замежных моў у сярэдняй школе адпавядаюць свайму назначэнню. У многіх выпадках работу гэтых выкладчыкаў амаль ніхто не правярае.

Сур'ёзныя недахопы мае выкладанне замежных моў і ў вышэйшых навучальных установах. Нават у такіх ВНУ, як Свердлоўскі, Кіеўскі і Одэскі індустрыяльныя інстытуты, Харкаўскі інжынерна-будаўнічы інстытут, Казанскі універсітэт, дзе у рэзультаце сур'ёзнай арганізацыйнай і навукова-метадычнай работы студэнты параўнаўча свабодна чытаюць замежную літаратуру, разгаворнымі навыкамі ўсё-ж валодаюць толькі асобныя студэнты. Частка студэнтаў няправільна вытлумачыла прадастаўленае ім права свабоднага наведвання часткі заняткаў. Не працуючы ў семінарах па замежных мовах, яны не займаюцца і дома.

У некаторых ВНУ педагогі ўдачна спалучаюць выкладанне замежнай мовы з той спецыяльнасцю, якую выбраў студэнт. Калі, скажам, заняткі вядуцца па заалогіі, студэнты чытаюць замежныя кнігі, прысвечаныя гэтай галіне ведаў. Такі метад палкам апраўдаў сябе, бо ён навочна пераконвае студэнтаў у тым, наколькі карысна замежная мова для іх далейшай практычнай работы. На жаль, гэты метад практыкуецца не ўсюды.

Вялікую дапамогу вывучаючым мовы можа аказаць радыё. Аднак яго ўзел у гэтай патрэбнай справе выражаецца толькі ў тым, што для завочнікаў па два разы ў тыдзень наладжваюцца радыёперадачы на нямецкай і англійскай мовах. Ды і гэтыя перадачы не даюць значнага эфекту, бо яны праводзяцца па радыёстанцыі, якую могуць прымаць толькі слухачы, якія маюць лампавыя радыёпрыёмнікі. Усесаюзнаму радыёкамітэту трэба было-б пераглядзець праграму сваіх перадач, каб забяспечыць завочнікам магчымасць слухаць радыёўрокі па станцыі ім. Комінтэрна, даступнай для мільёнаў слухачоў.

Сур'ёзны рахунак можна прад'явіць выдавецтвам. Выпускаючы зусім недастатковую колькасць спецыялізіраваных падручнікаў, а таксама вучэбных дапаможнікаў, самавучыцеляў па замежных мовах і літаратуры для самастойнага чытання, яны забываюць аб той велізарнай патрэбе, якая адчуваецца ў замежна-рускіх і руска-замежных агульнамоўных і тэхнічных слоўніках. Выданы ў 1938 г. англа-рускі тэхнічны слоўнік даўно ўжо стаў бібліяграфічнай радкасцю. Няма слоўнікаў па машынабудаўніцтву, металургіі, хіміі, зусім недастаткова задавальняецца попыт на замежную мастацкую літаратуру.

Вывучыць замежную мову можа любы грамадзянін, спалучаючы заняткі ў гуртку са сваёй асноўнай работай Такія гурткі створаны пры наркаматах, на прадпрыемствах, ва ўстановах. Аднак вялікая многа выпадкаў, калі гурткі, праіснаваўшы нядоўгі час, распадаліся. Часцей за ўсё гэта адбываецца з-за рознай ступені падрыхтоўкі гурткоўцаў, вялікай іх пякучасці, не заўсёды ўдачнага падбору выкладчыкаў. Вучоба ў гуртках толькі тады можа быць паспяховай, калі заняткі ў іх адбываюцца рэгулярна, а не ад выпадку да выпадку.

Далёка не ўсе спецыялісты скарыстоўваюць прадастаўляемыя ім магчымасці Гэта пацвярджаецца хоць-бы тым фактам, што попыт на замежную літаратуру якая ёсць у заводскіх бібліятэках, вельмі нязначны нават на такіх буйных маскоўскіх прадпрыемствах, як аўтазавод імені Сталіна, «Серп і молат», станкабудаўнічы завод імені Орджанікідзе і інш.

Інжынер-наватар, які жадае няспынна рухаць наперад тэхніку вытворчасці, абавязан ведаць, што ў галіне гэтай тэхнікі робіцца ў капіталістычных краінах. Не заўсёды дапамогуць перакладныя кнігі: яны часта выходзяць са спазненнем і не заўсёды дакладны, бо скрозь і ўсюды перакладчыкі некампетэнтны ў тэхнічных пытаннях.

Для далейшага пабеданоснага наступальнага руху на ўсіх участках нашага сацыялістычнага будаўніцтва трэба ўлічыць сусветны вопыт, накоплены ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, культуры. Зрабіць гэта без ведання замежных моў немагчыма. Гэта веданне абавязкова для любога культурнага чалавека нашай краіны. Яно неабходна ім для аўладання вяршынямі навукі і тэхнікі. Яно спатрэбіцца і ў ваенны час. Аб гэтым трэба заўсёды памятаць кожнаму совецкаму чалавеку, грамадзяніну вялікай сацыялістычнай дзяржавы.

Іншы спецыяліст, якому справядліва ўказваюць на неабходнасць вывучаць замежную мову, спасылаецца на тое, што ён перагружан, што яму нехапае часу для самаадукацыі. Але пры жаданні, пры адпаведнай настойлівасці людзі могуць выкраіць час і для заняткаў мовамі. Не абгрунтаваны і апасенні тых, хто мяркуе, што вывучэнне замежных моў звязана з непераадалімымі труднасцямі. Марксу было ўжо 50 год, калі ён узяўся за рускую мову. За шэсць месяцаў ён настолькі вывучыў яе, што чытаў у арыгіналах Пушкіна, Гогаля. Шчадрына. Значыць, справа не ў труднасцях, а ў сільным жаданні упорстве, у тых валявых якасцях, якія павінен выхоўваць у сабе кожны партыйны і непартыйны большэвік, калі ён хоча няспынна расшыраць свой кругазор, хоча стаць культурным, адукаваным чалавекам.

(Перадавы артыкул «Правды» за 23 мая г.

ШТОДЗЁННА КІРАВАЦЬ СЯЎБОЙ

Веснавыя палявыя работы ў раёне ў гэтым годзе пачаліся некалькі пазней, чым у мінулыя годы. Каб навярстаць прайшоўшы час, калгасы, соўгасы, машына-трактарныя станцыі павінны былі праявіць высокую арганізаванасць, вялікую напружанасць у рабоце.

Многія пярвічныя партыйныя арганізацыі нашага раёна правільна зразумелі свае задачы ў адказнейшы перыяд сельскагаспадарчых работ. Яны штодзённа кіруюць сяўбой, раз'ясняюць калгаснікам пастанову партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў, узнімаюць калгаснае сялянства на барацьбу за высокі сталінскі ўраджай.

Гэтыя партарганізацыі дабіліся таго, што веснавыя работы ў калгасах праходзяць узмоцненымі тэмпамі і на высокім агратэхнічным узроўні. Калгас імені Калініна, Асавецкага сельсовета (старшыня калгаса, ён-жа і сакратар пярвічнай партарганізацыі тав. Боргер), сяўбу каласавых закончыў яшчэ да 5 мая, тэхнічных культур да 10 мая. Зараз калгаснікі мабілізаваны на асушку забалочаных зямель.

Наш раён яшчэ да 15 мая выканаў план сяўбы каласавых. Але некалькі запягнулася сяўба ільну, бульбы і некаторых іншых культур.

Пасляхова працуюць на веснавой сяўбе трактарныя брыгады Цялушскай МТС. З першых дзён палявых работ разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі і асобнымі трактарыстамі. Людзі паказваюць высокія ўзоры соцыялістычнай працы. Так, трактарысты брыгады № 4 (брыгадзір Дзмітрый Мельнікаў) пры норме 240 гектараў узаралі 346 гектараў, што складае каля 150 процантаў плана Міхаіл Ляпёшкін на трактары «Універсал» выканаў план веснавых работ на 200 процантаў.

Зусім інакш працуе Гарбацэвіцкая МТС. На 15 мая яна выканала план трактарных работ толькі на 35 процантаў. Рашэнні партыі і ўрада не даведзены да трактарыстаў гэтай МТС; масава-палітычная работа ў трактарных брыгадах не праводзіцца.

Дрэнна кіруюць веснавымі палявымі работамі ў Каменскім сельскім совеце, калгасы якога непярпіма адстаюць з сяўбой. Тэрытарыяльная партыйная арганізацыя (сакратар партарганізацыі тав. Ханяк) праходзіць міма фактаў нарушэння працоўнай тысыкліны ў асобных калгасах, не мабілізуе калгаснікаў на ўзмацненне тэмпаў і якасці сяўбы.

Райком КП(б)Б прымае ўсе неабходныя меры для таго, каб неадкладна завяршыць веснавую сяўбу ва ўсіх калгасах раёна.

С. Е. РУДКОЎСКІ,
сакратар Бабруйскага РК КП(б)Б.

Марудзяць з сяўбой тэхнічных і кармавых культур

МАЗЫР. (**Спец. кар. «Звязды»**). Калгаснікі Палескай вобласці яшчэ 15 мая выканалі план сяўбы каласавых культур. Адзін з перадавых у Васілевіцкім раёне калгас «Абарона краіны» яшчэ 25 красавіка закончыў сяўбу зернавых культур.

Зусім іншае становішча ў большасці калгасаў вобласці з пасадкай бульбы і сяўбой ільну, гародніны і кармавых коранеплодаў.

Прайшлі ўсе тэрміны сяўбы, апранулася ў лісце лясы, падняслася трава на лугах, а ў радзе калгасаў толькі цяпер вязуць гной пад бульбу і рыхтуюць глебу пад лён. За апошнія 5 дзён процант выканання плана сяўбы ільну па вобласці павысіўся з 79,7 да 88,7. На 20 мая ў адным толькі Мазырскім раёне не пасаджана звыш 200 гектараў бульбы і не засеяна больш палавіны плошчы гародніны.

Толькі 22 мая тав. Дворак, старшыня калгаса «Котас Кастрычніка» (Мазырскі раён) сабраўся нарэшце забраць вызначанае яму насенне ільну. Гэтаму калгасу трэба было пасеяць 8 гектараў кармавых коранеплодаў, аднак ніводнага гектара ён яшчэ не пасеяў.

— Дажджы перашкаджаюць, глеба тразкая, — гаворыць тав. Дворак.

Падобныя разважанні і спасылкі на «мокрае» надвор'е нагадваюць і ў Петрыкаўскім раёне. Старшыня калгаса імені Кірава Міхаіл Азёма прапануе калгаснікам сеяць тады, калі «ўстановіцца добрае надвор'е». У радзе калгасаў гэтага раёна прастаівалі трактары з-за нясвоечасовай падвозкі гаручага.

У вобласці недапушчальна зацягнулася сяўба сілосных культур і коранеплодаў, план сяўбы іх выкананы толькі на 37,6 процанта. У Глускім раёне да 20 мая ляжала на складзе 900 кілаграмаў насення цукровых буракоў, якія трэба пасеяць замест кармавых коранеплодаў. Больш таго, на складзе ляжыць незабранае калгасамі насенне кармавой бручкі і кармавой капусты. Выклікапыя ў аблвыканком прадстаўнікі Глускага раёна вымушаны былі шчыра прызнацца, што ў раёне яшчэ няма сапраўднай барацьбы за стварэнне моцнай кармавой базы для жывёлагадоўлі. Не вядзецца барацьба за кармавую базу, а значыць і за жывёлагадоўлю, і ў калгасах Калінкавіцкага і Мазырскага раёнаў.

А. МАТУСЕВІЧ.

За высокі ўраджай ільну

ПОЛАЦК. Лён займае віднае месца ў пасеўным плане раёна. Пастанова партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы ўзняла творчую актыўнасць калгаснікаў у павышэнні ўраджайнасці ільнопрадукцыі. Арганізаваныя 496 ільнаводчых звеньняў спаборнічаюць за высокі ўраджай ільну. Усе яны абавязаліся перавыканаць лаведзеныя ім планы ўраджайнасці.

Звяно ордэнаносца Фядоры Лешкоўскай з калгаса імені Ільіча абавязалася атрымаць 12 пэнтнераў ільновалакна з гектара. Участак ільну засеян чыстасортным насеннем на добра апрацаванай і ўтноенай глебе. Цяпер за пасевамі арганізаван старанны догляд.

Звяно Ульяны Лапенка з калгаса «Соцыялізм» пасеяла лён па канюшынішчы. Сеялі ільняной сеялкай. На кожны гектар унесена па 3 цнт. суперфасфату, 2 цнт. попелу і іншыя ўгнаенні. Звяно змагаецца за атрыманне 11 пэнтнераў ільновалакна з гектара.

На высокім агратэхнічным узроўні праведзена сяўба ільну на плошчы ў 37 гектараў і ў калгасе імені Сталіна.

(БЕЛТА).

Завяршылі сяўбу яравых

КАМЯНЕЦ. (Брэсцкая вобласць). У раёне закончана сяўба яравых культур. Паявіліся ўсходы ранніх зернавых. Калгаснікі паказалі выключную арганізаванасць на сяўбе.

Ва ўсіх калгасах раёна створаны пастаянныя звенні па тэхнічных і гародных культурах. Ільнаводчае звяно Антаніны Дробыш—з калгаса імені Молатава — абавязалася атрымаць на сваім участку не менш 4.5 пэнтнера ільносемя і 4 пэнтнеры ільновалакна з гектара. Зараз звенні рыхтуюцца да прапоўкі і падкормкі тэхнічных культур.

На каучуканосных плантацыях

ВАСІЛЕВІЧЫ. Перадавыя калгасы імені Будзёнага, імені Кірава і «Парыжская комуна» яшчэ ў красавіку закончылі сяўбу кок-сагыза. На палях паявіліся дружныя ўсходы, абяцаючыя высокі ўраджай.

На каучуканосных плантацыях разгортваецца работа па догляду пасеваў. У калгасе імені Кірава прапалата ўжо 5 гектараў кок-сагыза і зроблена рыхленне міжраддзяў. У калгасе «Большэвік» рыхленне міжраддзяў зроблена на плошчы ў 3.8 гектара.

(БЕЛТА).

Стаханаўцы-грабары калгаса імені Сталіна, Васілевіцкага раёна, выконваюць норму на 580 процантаў. На здымку (злева направа): П. Рудзенка, С. Брыль, Н. Захарэнка.
Фото І. Казловіча.

Асушаем 320 гектараў балота

У нашым калгасе 500 гектараў балота, яны займаюць больш трэці ўсёй нашай зямлі. Карысці мы бачылі ад яго вельмі мала, сена касілі на 100 гектарах, а на астатніх толькі збіралі журавіны. Ураджай сена атрымлівалі не больш 3—4 пэнтнераў з гектара.

Калгас кожны год цярпеў вялікую нястачу кармоў, а жывёлагадоўчыя фермы растуць — зараз у нас 115 галоў рагатай жывёлы, 114 коней, 84 авечкі, больш 90 свіней.

І вось у 1939 годзе калгаснікі зрабілі першы крок — пачалі праводзіць асушку балота. За год асушылі 40 гектараў, на 8 гектарах правілі залужэнне. Ужо тады атрымалі па 25—30 пэнтнераў кармоў з аднаго гектара. Гэта натхніла, падбадзёрыла калгаснікаў. У 1940 годзе яны замест 20 гектараў па плану асушылі 120 гектараў балота. Уся гэта плошча зараз асвойваецца: пасеялі 40 гектараў аўса, 20 гектараў вікі з аўсом, 10 гектараў ячменю і іншыя культуры. Як толькі пачало падсыхаць, на балоты выйшаў трактар.

Калгаснікі, абмеркаваўшы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушцы балот, абавязаліся асвоіць 320 гектараў забалочаных зямель. За зіму яны ачысцілі ад хмызняку 73 гектары.

Зараз у нас наступіў самы гарачы час. Мы спалучаем палявыя работы і меліярацыю. Многія калгаснікі паказваюць добрыя ўзоры работы. Аксіння Буртылёва і Дуня Чарнякова даюць па кошцы канавы па 200 проц. нормы.

Згодна графіка меліяратыўных работ 320 гектараў балота мы асушым за 19—20 дзён. Пасля сяўбы ў нас штодзённа будзе выходзіць на балоты больш 220 калгаснікаў.

Асваенне забалочаных зямель дасць нашаму калгасу вялікую карысць. Мы значна павысім ураджайнасць і вагу калгаснага працадня.

З. І. ПІШЧАЛАЎ,
старшыня калгаса «Праўда», Бялыніцкага раёна.

На Углоўскім балоце

ШАРОЎЛЯ. (**Спец. кар. «Звязды»**). У паўднёвай частцы раёна прасціраюцца абшырныя балоты. Велізарны балотны масіў прарэзае Мухаедаўскі канал. Канал быў пракладзен даўно і з адной толькі мэтай—спілаўляць лес. Вакол канала да апошняга часу ляжалі некранутымі каля 15.000 гектараў забалочанай зямлі.

Зараз на гэтым масіве разгортваюцца вялікія меліяратыўныя работы. Асабліва інтэнсіўна ідзе асушка Углоўскага балота. 15 мая сюды з'ехаліся калгаснікі-меліяратары з 18 сельгасарцелей раёна. Ад ранняя да вечара на Углоўскім балоце кіпіць напружаная работа. Больш 800 калгаснікаў, узброеных лапатамі і тапарамі, адначасова пракладаюць чатыры магістральных каналы.

З першага-ж дня работы сярод калгаснікаў шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Грабары змагаюцца за заваяванне пераходнага чырвонага сцяга райкома партыі і выканкома райсавета.

16 мая гэты сцяг быў уручан сельгасарцелі «Чырвоны Кастрычнік». 154 калгаснікі гэтай арцелі выканалі ў сярэднім норму выпрацоўкі на 150 процантаў. На другі-ж дзень сцяг быў перадан калгаснікам сельгасарцелі імені Молатава, якія выканалі дзённую норму ў сярэднім на 200 процантаў.

Характэрна, што калгаснікі сельгасарцелі імені Молатава размясціліся не ў вёсцы, а на балоце ў шалашах.

— Будзем працаваць, як ферганны,— заявілі яны.

За чатыры дні работы на Углоўскім балоце пракапана магістральных каналаў на плошчы ў 6.521 гектар, выкінута 17.500 кубаметраў цвёрдага грунту.

Вечарам, пасля работы, у вёсны Углы у якой размясцілася большасць прыезджых калгаснікаў, чутны песні, гукі гармонікаў, ідзе пажаз мастацкай самадзейнасці. Весела і на балоце ля шалашоў калгаса імені Молатава.

Любіце свой горад, сваё калгаснае сяло

ПЛЕНУМ РАЙКОМА КП(б)Б, ПРЫСВЕЧАНЫ ДОБРАБЫТУ РАЁНА

Пленум Кагановіцкага райкома КП(б)Б г. Мінска заслухаў даклад старшыні выканкома райсовета дэпутатаў працоўных тав. Папок аб добрабыце раёна.

— Жылыя памяшканні,—гаворыць дакладчык, — часта вельмі хутка знаходзяцца з прычыны дрэннага догляду іх, неакуратнага карыстання імі. У значнай частцы домаўпраўленняў панае безгаспадарчасць, антысанітарыя. Часта жыхары на кухні колюць дровы, ператвараюць ванны ў сховішчы гародніны, засмечваюць каналізацыю. Упраўляючыя дамамі рэдка бываюць у кватэрах.

Дзяржава адпускае велізарныя сродкі на добрабыт горада. У гэтым годзе на ўпарадкаванне вуліц і сквераў раёна адпушчана 1.247 тысяч рублёў. Аднак паспяховае правядзенне намечаных мерапрыемстваў немагчыма без удзелу шырокіх мас, усяго насельніцтва раёна.

Райком КП(б)Б і выканком райсовета арганізавалі пры домаўпраўленнях брыгады, у саставе якіх увайшлі ўрачы, дэпутаты райсовета, актыў жыхароў. Брыгады павінны клапаціцца аб чыстаце і культуры ў кватэрах, дварах, на вуліцах. Выбіраюцца таварыскія суды і грамадскія санітарныя інспектары, якія павінны весці дзейсную барацьбу за чыстату ў горадзе.

Выступаўшыя ў спрэчках па дакладу сакратар партарганізацыі Медінстытута тав. Вігдаровіч, дырэктар млынкрупазавода № 4 тав. Блюмкін, сакратар бюро партарганізацыі завода імені Мяснікова тав. Лобач, загадчык дзіцячага дома № 4 тав. Карпман, сакратар райкома КП(б)Б тав. Нікіфарава і іншыя падкрэслілі вялікую ролю партыйных і совецкіх арганізацый у справе мабілізацыі насельніцтва на барацьбу за культуру і чыстату ў горадзе.

Выступаўшыя ўказвалі таксама на неабходнасць шырока прыцягваць жыхароў да азелянення горада: разбіўкі клумб, насаджэння дрэў, кветак у дварах і т. д.

Пленум прыняў па дакладу рашэнне, у якім заклікаў пярвічныя партыйныя арганізацыі ўзначаліць паход за культуру і чыстату ў раёне.

Упарадкаванне гарадскіх пасёлкаў

З кожным годам растуць і распыраюцца гарадскія пасёлкі Мінска. Выканком горсовета дэпутатаў працоўных намеціў у гэтым годзе рад мерапрыемстваў па іх упарадкаванню.

У пасёлку «Коминтэрн» адрэмонтаваны і пабелены фасады дамоў. На Групаўскім пасёлку і ў пасёлку «Коминтэрн» будуць пракладзены праўляныя тратуары. У пасёлку імені Фрунзе праводзяцца значныя работы па азеляненню. Пасаджаны дэкаратыўна-цвітучыя кусты, у чэрвені будуць пасаджаны кветкі, а восенню — звыш 300 дрэў.

Па ініцыятыве дэпутата горсовета прафесара Сігэрмана, для выгоды жыхароў пасёлка імені Фрунзе прарэзана дарога, якая злучае Саломеную вуліцу з Палярнай; гэта значна скараціла пад'езд да пасёлка.

(БЕЛТА).

Кветкі на вуліцах горада

МАГІЛЕЎ. Гарадскі сад імені Горкага з'яўляецца любімым месцам адпачынку працоўных горада. Зараз сад упрыгожваецца. Высаджваюцца дэкаратыўныя дрэвы, разбіваюцца клумбы, заканчваецца рамонт фантана, расшыраецца летні тэатр. Для дзяцей пабудаваны прыгожыя пляцоўкі. Хутка будзе закончан рамонт рэстарана, чытальні, більярднай.

Дэкаратыўныя дрэвы, кусты, тысячы півонаў, георгін высаджваецца на новых скверы па Першамайскай вуліцы, якія разбіт на месцы былой звалкі. Упрыгожваецца сквер, што каля кінотэатра «Чырвоная зорка». Зялёныя насаджэнні будуць зроблены і на Першамайскай вуліцы, у Лупалаўскім парку, на тэрыторыі магілеўскіх дамоў адпачынку.

На азеляненне Магілева асігнавана 80 тысяч рублёў. (БЕЛТА).

Горад азеляняецца

Беласток — адзін з самых прыгожых гарадоў рэспублікі.

У гэтым годзе намечана правесці значныя работы па далейшаму азеляненню Беластока. За лета будзе высаджана 1.300 тысяч кветак, звыш 6.000 дэкаратыўных і фруктовых дрэў, 13.000 кустоў. На Ленінскай, Совецкай і іншых вуліцах узнікнуць новыя скверы і кветнікі. Работа па азеляненню горада ў разгары.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

Няўдалыя вопыты

Кніга яўрэйскага паэта Г. Камянецкага — «Заказ на маладосць» складаецца з вершаў і паэм, пераважная частка якіх публікуецца ўпершыню. Але, на вялікі жаль, гэту кнігу нельга аднесці да дасягненняў паэта.

Паэмы, змешчаныя ў кнізе, можна ў лепшым выпадку разглядаць як вопыты, але вопыты няўдалыя. У паэме «Праз агонь і ваду» Камянецкі паспрабаваў паказаць новага героя ў нашай паэзіі — цырульніка, які прайшоў праз «агонь і ваду» грамадзянскай вайны, і загінуў у барацьбе з ворагамі рэвалюцыі па фронце.

Фабула гэтай паэмы наступная. Цырульнік Афройка, партызан, цяжка ранен у часе сутычкі з польскімі ўланамі. Таварышы адводзяць яго ў горад, дзе ў Афройкі ёсць сваяк. Там Афройка выздараўлівае. У сваяка ёсць дачка Стэра, якая выходзіць замуж за Афройку і прымушае яго адкрыць «цырульны зал». Афройка становіцца гаспадаром цырульні. Ён не вытрымлівае канкурэнцыі са старым цырульнікам — Мейлахам, у якога ёсць «падыход да багатых кліентаў». Афройка астаецца без кліентуры. Ён сумуе па партызанскаму атраду. Пасля аднаго выпадку (сутычкі з польскім каменданцтвам), ён вымушан упячы разам з сваёй жонкай (якая ўжо становіцца яго адпадумцай) да партызанаў. І тут ён гіне ў сутычцы з ворагам.

Матэрыял гэтай паэмы як-быццам арытмічны, але стварыць жывы вобраз паэту не ўдалося. Яму не хапае слоў і фарбаў для характарыстыкі свайго галоўнага героя. Цырульнік-партызан атрымаўся ў Камянецкага нейжім абыякавым, халодным індывідуалістам, ад якога становіцца не па сабе. І мы, вядома, верым паэту, калі ён гаворыць, што Афройка астаўся без кліентаў. Пакінулі яго не толькі багатыя кліенты, але і тыя 2—3 шаўцы і майстэравыя, якія «брынюцца ў доўг», — пакінулі незадачлівага цырульніка, у якога з усіх бакоў тырчыць яго «чалавечае дастоінства».

Камянецкі, як відаць, не заўважае, што, узняўшы Афройку, ён адначасова заплямяў шаўца і майстэравых; пачышаем наогул сумняваецца ў «дэмакратызме» Афройкі і ў яго сапраўднай чалавечай годнасці.

У паэме зусім не паказан калектыў, у акружэнні якога знаходзіцца герой. Няма вакол яго людзей, таварышоў. Астаецца таксама невядомым, якім чынам ён упершыню трапляе ў партызанскі атрад. Па сваёй пабудове паэма схематычна і наўрад ці наш совецкі чытач знойдзе чаму павучыцца ў ёй.

Яшчэ горш абстаіць справа з другой паэмай — «Лопнула», якая наогул не новая як па замыслу і ідэі, так і па мастацкаму афармленню. Гэта перапеў, варыяцыя мноства вершаў і паэм аб шкодніцтве, ліквідацыі кулацтва і т. д. Аб гэтым у яўрэйскай літаратуры паэт Перэц Маржін ужо даўно стварыў шырокае мастацкае палатно з манументальным адмоўным вобразам кулака. І Камянецкі тут не дадаў нічога новага, апрача некаторых сумніцельных сюжэтных дэталей: у Маркіша памірае кулак, а тут памірае жонка кулака. Самаго-ж кулака Камянецкі ўводзіць у дом для прэстарэлых — у «багадзельню». Тут кулак будзе помсціць совецкай уладзе тым, што «жыве на ўсім гатовым у Совецкім».

Яўна прымітыўнае і смехатворнае ўяўленне аб кулаку, і мы ахвотна верым апошнім словам паэмы, дзе гаворыцца, што

«Малюнак касыбы так прыгожы,
Тысячу раз прыгажэй майго верша».

У паэмах Камянецкага ёсць многа добрых радкоў, рытмы, вытрыманыя па ўсіх правілах паэтыкі, прыгожыя рыфмы. Відаць, што на ўсё гэта паэтам патрачана нямала энергіі, і таму яшчэ больш прыкра за амаль даремна патрачаную працу, якая не прыносіць нічога новага.

Удаліся Камянецкаму яго асобныя лірычныя вершы. Там, дзе ён бярэцца за вялікія «майстэрскія» творы з надуманымі і трафарэтнымі сюжэтамі і сітуацыямі, — ён перапіць няўдачы, там-жа, дзе ён перадае сваё ўласнае паэтычнае пачуццё, захапленне гераічнымі з'явішчамі ў нашым жыцці, — ў яго амаль заўсёды па сапраўднаму цікавыя, своеасаблівыя, абаяльныя вершы, мільгаціць юмар і астраум'е, ёсць і фантасія і мысль. Гэта можна бачыць у лірычных вершах зборніка «Заказ на маладосць», за выключэннем вялікага ўступнага верша, які вызначаецца той-жа штучнасцю, што і паэмы

І. СЯРЭБРАНЫ.

ПАСПЯХОВА ПРАВЯДЗЕМ ІСПЫТЫ Ў ШКОЛАХ

Е. І. УРАЛАВА
Народны камісар асветы БССР.

20 мая ў школах нашай рэспублікі, як і ў школах усяго Совецкага Саюза, пачаліся праверачныя і выпускныя іспыты.

Настаўнікі, школьнікі, бацькі, уся совецкая грамадскасць прасякнуты сазнаннем, што іспыты — гэта адказнейшы этап у жыцці совецкай школы, калі яна робіць справаздачу аб сваёй упорнай і пладатворнай дзейнасці за увесь прайшоўшы вучэбны год.

Іспыты не з'яўляюцца лёгкім заключным акордам школьнай работы. Яны — складаны педагагічны працэс, які патрабуе ад экзаменатара, ад настаўніка і кіраўнікоў школ, ад органаў народнай асветы высокага педагагічнага майстэрства, любві да дзяцей, майстэрства большэвіцкага кіраўніцтва.

XVIII Усесаюзная партыйная канферэнцыя, якая выразіла волю большэвіцкай партыі і ўсяго совецкага народа, з усёй вастрынёй паставіла пытанне аб кантролі і патрабавальнасці ва ўсіх галінах народна-гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Гэта палкам адносіцца і да школы.

Совецкая школа не можа далей цярпець другагодніцтва, што з'яўляецца бракам у рабоце. Праверачныя і выпускныя іспыты закліканы даць аб'ектыўную, справядлівую ацэнку сапраўдных ведаў вучняў, моцнасці засваення імі асноў навукі. Іспыты ў той-жа час, пры правільнай арганізацыі кантролю, паказваюць недахтаванасць кожнага настаўніка, наколькі аддана і чэсна ён працуе.

Школа наша заклікана выхоўваць гарачых патрыётаў нашай социялістычнай радзімы, прывіваць нашым школьнікам усе лепшыя якасці, характэрныя для большэвіка: мужнасць, храбрасць, чэснасць, адданасць, працавітасць. Не можа быць такога становішча, каб настаўнік, вучань, бацька, комсамолец, піонер роўнадушна адносіўся да ходу іспытаў у школе. Кожны з іх павінен прымаць бліэка да сэрца і поспехі і няўдачы, выяўляемыя ў працэсе іспытаў.

Кіраўнікі школ і аддзелаў народнай асветы павінны ўдзяляць асаблівую ўвагу пытанням кантролю, не дапускаць малейшых праяўленняў лібералізма ў ацэнцы ведаў вучняў. Разам з гэтым трэба выяўляць тых настаўнікаў, якія па працягу года займаліся очкаўпірацельствам, завышалі ацэнкі ведаў вучняў і гэтым самым абманвалі органы народнай асветы, кіраўнікоў школ, дзяцей, а сям-там і саміх сябе.

Настаўнікаў-бракаробаў у нас не так ужо многа, але яны ёсць. Іх трэба выявіць у часе іспытаў, каб аслабаніць школы к будучаму году ад такіх работнікаў і гэтым самым яшчэ лепш паладзіць комуністычнае выхаванне нашай дзетвары.

У мінулым годзе быў рад выпадкаў, калі выпускнікі сярэдніх школ, атрымаўшыя вылатныя і добрыя ацэнкі, аказваліся малапісьменнымі ў ВНУ, у педвучылішчах, у тэхнікумах. Мелі месца выпадкі калі выпускнікі-выдатнікі сярэдняй школы, прынятыя без іспытаў у ВНУ не ведалі элементарных правілаў рускай і беларускай граматыкі, не ўмелі рашаць элементарных матэматычных задач, карыстацца прыборамі па фізіцы і хіміі, чытаць геаграфічную карту.

Нельга больш дапускаць такіх з'яў. Выпуску браку з совецкай школы павінен быць пакладзен канец.

Першы дзень іспытаў у школах г. Мінска пацвярджае, што абсалютная большасць школ правільна зразумела дзяржаўнае значэнне і сутнасць праводзімай праверкі. У многіх школах горада адзначана прыемная з'ява: ацэнкі на іспытах поўнасцю адпавядаюць ацэнкам, якія вучні атрымлівалі на працягу вучэбнага года і па чвэрцях. У радзе выпадкаў ацэнкі, атрыманыя на іспытах, нават вышэй ацэнак, якія вучні мелі ў году. Гэта наглядаецца, напрыклад, у настаўніка фізікі 25-й сярэдняй школы тав. Міхліна, у настаўніка рускай мовы 9-й сярэдняй школы тав. Краснапеўцава, у настаўніка геаграфіі 4-й сярэдняй школы тав. Правашынскага, у настаўніка матэматыкі 25-й школы тав. Манькоўскага і ў ряду другіх.

Гэта сведчыць, што лібералізма ў паказаных настаўнікаў на працягу года не было, а адсюль і выдатныя выніковыя ацэнкі за год. У гэтых настаўнікаў абсалютная большасць вучняў здае іспыты толькі на «выдатна» і «добра». Настаўнік Міхлін праводзіць іспыты па фізіцы ў фізічным кабінеце школы. На сталах расстаўлены ўсе прыборы і наглядныя дапаможнікі. Вучні ўмела збіраюць трансфарматар, уключаюць электрычную праводку, прыводзяць у рух дзеючыя мадэлі розных машын. Адчуваецца, што за год прароблена вялікая пладатворная работа.

У настаўніка геаграфіі 4-й сярэдняй школы тав. Правашынскага вучні свабодна чытаюць геаграфічную карту.

Большасць школ добра падрыхтавалася да іспытаў, забяспечыла чыстату, парадак, утульнасць. Усё прадугледжана. У кабінетах па геаграфіі развешаны геаграфічныя карты, па батаніцы—расстаўлены наглядныя дапаможнікі. Кабінеты фізікі, хіміі добра аснашчаны і гатовы да паслуг вучняў. Адведзена рабочае месца для праверкі пісьмовых работ. Падрыхтаваны папера, алоўкі, чарнілы і т. д.

Аднак не ўсюды так абстаіць справа. Ёсць выпадкі калі кіраўнікі школ і настаўнікі палыйшлі несур'ёзна і безадказна да падрыхтоўкі да іспытаў і да самога правядзення іх.

У 3-й сярэдняй школе г. Мінска першы дзень іспытаў прайшоў дрэнна. У школе брудна, у класах, дзе праходзяць іспыты, навалены паламаныя крэслы, быццам іх не было куды ўбраць. Настаўнікі і вучні ходзяць у паліто і на перапынках, і на саміх іспытах. У гэтай школе мы не прыкмецілі вучняў з гальштукамі, нібы тут няма ні аднаго піонера.

На іспытах па батаніцы ў 6 класе (настаўніца тав. Дарафеенка) карты і табліцы былі навешаны ў беспарадку. Прысутнічаўшы асістэнт — настаўніца Сурпіна пасіўна назірала за ходам іспытаў.

У гэтай-жа школе пры праверцы дыктовак па рускай мове ў 4 класе настаўніца Сачок дапусціла пропускі памылак, з мэтай завышэння адзнак вучням. Мы праверылі 26 работ. З іх у 10 аказалася, што настаўніца Сачок завысіла ацэнкі ведаў. А прысутнічаўшая пры гэтым асістэнтка — настаўніца Курэк таксама расписалася ў правераных спытках, фармальна і злачынна аднёсшыся да сваіх абавязкаў.

Выконваючы абавязкі дырэктара школы, настаўнік Міхневіч праявіў поўную безадказнасць і разгубленасць. Ніякага кантролю над падрыхтоўкай настаўнікаў да іспытаў ён не забяспечыў. На саміх іспытах ён ні ў адным класе не прысутнічаў.

У 29-й школе настаўніца Немельман на іспытах па Канстытуцыі задавала вучням блытаныя пытанні. Вучні адказвалі нязвязна, вяла. Відаць было, што яны дрэнна, зусім не цвёрда ведаюць пройдзены матэрыял.

Ёсць факты, калі іспыты выяўляюць бракаробаў, якія на працягу года ашуквалі і аддзелы народнай асветы і кіраўніцтва школы і сваіх-жа выхавальнікаў-вучняў. Вось настаўнік 33-й сярэдняй школы г. Мінска Ганжын. Ён на працягу года ўсюды расхвальваў самога сябе, заўсёды быў у прэтэнзіі да ўсіх. А ў першы дзень іспытаў кантрольную дыктоўку ў яго 4-м класе напісалі з пераводнымі ацэнкамі менш 30 проц. вучняў. Больш 70 проц. напісалі дыктоўку на «дрэнна» і «вельмі дрэнна»! Гадавая-ж ацэнка пісьменнасці вучняў яго класа па рускай мове складае 84 проц. Ці не ясна, што ад такіх бракаробаў школа павінна пеаклала аслабаніцца.

Работнікі аддзелаў народнай асветы павінны ўлічыць усё станоўчае, што выяўлена ў школах у першыя дні іспытаў і перадаць гэты вопыт усім школам. Усё адмоўнае павінна быць неадкладна знішчана.

На іспытах трэба праверыць, наколькі ў гэтым годзе нашы школы справіліся з задачай прывіцця практычных навыкаў вучням. Гэта можна ўстанавіць у першую чаргу шляхам праверкі ўмення вучняў працаваць з прыборамі і прэпаратамі па фізіцы, хіміі, прыродазнаўству, умення рашаць практычныя задачы па арыфметыцы алгебры і фізіцы.

Школа павінна штодзённа падводзіць вынікі іспытаў за дзень з тым, каб упікаць дапушчаных памылак у наступны дзень іспытаў. Нельга мірыцца з пасіўнай і абыякавай прысутнасцю на іспытах асістэнта. Ён павінен поўнасцю ажыццяўляць тут свае функцыі дзяржаўнага кантролю.

Зусім недапушчальна, калі на іспытах дзесятых класаў адсутнічаюць прадстаўнікі аддзелаў народнай асветы. Гэта ўжо мела месца, напрыклад, у 15-й школе г. Мінска.

Няма сумнення, што настаўніцтва нашай рэспублікі, як і настаўніцтва ўсяго Совецкага Саюза, з чэсцю справіцца з вялікай і адказнай задачай данага перыяда. Іспыты будуць праведзены на высокім ідэйна-палітычным і дзелавым узроўні. Чым больш у гэтай справе будуць праяўлены кантроль і патрабавальнасць з боку работнікаў органаў народнай асветы і дырэктараў школ, тым большая карысць будзе для школы, для нашай радзімы.

З а р у б я ж о м

Вайна ў Еўропе, Афрыцы і Азіі

(Дзённік ваенных дзеянняў)

На англа-германскім фронце нічога істотнага не адбылося. Як паведамляецца ў зводцы германскага камандавання, днём 22 мая германская авіяцыя рабіла разведчыя палёты над Англіяй і англійскімі тэрытарыяльнымі водамі.

***

У басейне **Міжземнага мора** найбольш жорсткія баі адбываюцца на востраве Крыт. 21 мая на працягу ўсяго дня, указваецца ў зводцы англійскага камандавання, новыя атрады германскіх парашутыстаў і войскі, перакідваемыя на самалётах, прабавалі прызямліцца ў розных пунктах вострава. Высадка германскіх паветраных дэсантаў прадаўжаецца. Для перакідкі дэсантаў на Крыт марскім шляхам, паведамляе каірскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, немцы скарыстоўваюць невялікія судны, якія перасякаюць па раўнальна вузкую паласу мора паміж Крытам і Паўднёвай Грэцыяй. Згодна камунікэ англійскага камандавання, германскія судны або ўцякалі або былі затоплены. Каірскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс сцвярджае, што германскія парашутныя дэсанты высаджваліся галоўным чынам днём. У даны момант, прадаўжае ён, баі адбываюцца ў раёне Гераклі-она (КанДыя), Рэтымні, Малемі, Канеі і ў заліве Суды. Немцам удалося замацавацца, перадае агенцтва Рэйтэр, толькі ў адным значным пункце — на аэрадроме ў Малемі. Ваенны аглядальнік агенцтва Рэйтэр генерал Губерт Гоф піша, што зыход баёў на востраве Крыт мае велізарнае значэнне для абодвух ваюючых старон. Наколькі можна меркаваць па маючыхся вестках, прадаўжае ён, баі развіваюцца спрыяюча для англічан. Большая частка першага германскага паветранага дэсанта знішчана, а астатняя — захвачана ў палон. Аднак немцы быстра перакідваюць па паветру буйныя падмацаванні першаму дэсантнаму атраду. Блізасць грэчаскага мацярыка да вострава Крыт дае магчымасць немцам сканцэнтраваць магутныя ваенна-паветраныя сілы і вялікія воінскія часці для ўтаржэння на востраў. Далей Гоф піша, што немцы прабуюць пад прыкрыццём пемры перакінуць падмацаванні таксама і па мору. Аднак для паспяховага ажыццяўлення гэтай задачы немцы перш за ўсё павінны замацавацца на востраве ў непасрэднай блізасці ад узбярэжжа або гавані з тым, каб прыкрыць высадку дэсанта з мора. Немцы скінулі ў розных частках вострава вялікую колькасць параўнаўча дробных атрадаў з мэтай выклікаць паніку і замяшанне, а таксама перарваць камунікацыі. Аднак невялікія атрады праціўніка, ізаліраваныя на адзінокіх узгорках і не маючыя магчымасці з'яднацца, не прадстаўляюць сур'ёзнай пагрозы. Тым не менш атака з паветра, упершыню прадпрымаемая ў такім шырокім маштабе, стварае вялікія цяжкасці для абароны, бо апошняя вымушана распыляць свае сілы на вялікай плошчы. У саставе англійскіх механізаваных сіл на Крыце, паведамляе каірскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, ёсць танкі і матарызаваная артылерыя. На востраве, апрача англійскіх і аўстралійскіх войск, сканцэнтрыраваны 2 грэчаскія дывізіі. Газета «Таймс», закранаючы баі на востраве Крыт, піша, што англічане «маюць магчымасць не дапусціць перакідкі артылерыі і танкаў праціўніка на востраў. Ёсць дастаткова грунтоўныя падставы для таго, каб спадзявацца, што гарнізон Крыта захавае за сабой пануючае становішча ў адбываючайся жорсткай барацьбе».

У Паўночнай Афрыцы, у раёне Тобрука і ля Солума, актыўных ваенных дзеянняў не было. Адзначаецца дзейнасць разведчых атрадаў. Германскія самалёты, гаворыцца ў зводцы германскага камандавання, бамбардыравалі харчовыя базы пабліку Тобрука і атакавалі на дарозе Солум—Сіді-Барані аўтакалону англічан. Англійская авіяцыя, перадае карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, зрабіла налёт на германскія аўтатранспартныя калоны ў Лівіі. Бамбардыроўцы падвергся таксама Бенгазі.

Ва Ўсходняй Афрыцы, у Абісініі, згодна зводкі італьянскага камандавання, англійскія часці прадаўжаюць аказваць націск на італьянскія пазіцыі ў раёне Гала-Сідамо. У камунікэ англійскага камандавання на Бліжнім Усходзе паведамляецца, што ў раёне Гондара англа-суданскія войскі ўвайшлі ў цеснае сутыкненне з італьянскімі войскамі ў ваколіцах Чыльгі. У гэтым раёне дзве італьянскія дывізіі акружаны англійскімі калонамі, наступаючымі з поўначы і поўдня. На захад ад Шашамана англійскія войскі атакавалі асноўныя пазіцыі італьянскіх войск. Італьянцы прадпрынялі контратаку, у якой ўдзельнічалі танкі.

У Паўднёвай Абісініі англійскія перадавыя часці атакавалі ар'ергард італьянцаў, які складаўся з трох батальёнаў каланіяльных войск і штаба брыгады.

***

У Іраку асноўныя баі адбываліся ў раёне Эль-Фалуджы. Іракскія войскі, гаворыцца ў камунікэ іракскага камандавання, атакавалі войскі англічан у раёнах Эль-Фалуджы і Хабані. Паводле паведамлення багдадскага карэспандэнта агенцтва Гавас-Офі, у Іраку аб'яўлена, што горад Эль-Фалуджа зноў перайшоў у рукі іракскіх войск. На паўднёвым фронце адзначаецца дзейнасць іракскай авіяцыі. Самалёты іракскіх паветраных сіл бамбардыравалі ваенны лагер англічан у Сінельдэбане.

Англійскія самалёты зрабілі разведчыя палёты над лагерамі Вашваш і Рашыд, а таксама над Багдадам.

23 мая. (ТАСС).

Амерыканскі друк аб германскай тактыцы на востраве Крыт

НЬЮ-ЙОРК, 21 мая. (ТАСС). Амерыканскі друк удзяляе вялікую ўвагу прымяненню немцамі планераў для перакідкі войск на востраў Крыт. Друк указвае, што ўпершыню гэту тэхніку прымяніў СССР, а немцы зараз яе скарыстоўваюць. Газета «Нью-Йорк геральд трыбюн» змяшчае паведамленне аб гэтым пад наступным загалоўкам: «Расія першая правозіла вопыты па перакідцы войск на планерах». Газета ўказвае, што Совецкі Саюз звыш 10 год таму назад праводзіў вопыты па перакідцы войск на планерах. Пры некаторых вопытах, паводле паведамленняў, адзін самалёт цягнуў на буксіры да 25 планераў.

Газета «Нью-Йорк Таймс» таксама ўказвае, што Совецкі Саюз з'явіўся яшчэ многа год таму назад піонерам скарыстання планераў у ваенных мэтах. «Магчыма, — прадаўжае газета, — што рускія вопыты яшчэ ў той час прыцягнулі ўвагу германскіх ваенных экспертаў. Англійская армія, відаць, ігнаравала гэты рускі вопыт, а амерыканская армія адвергла яго».

ВАЙНА Ў КІТАІ

(Агляд з 16 па 23 мая)

На працягу мінулага тыдня баі на поўдні правінцыі Шаньсі прадаўжаліся з неаслабяваючай сілай. Па апошніх даных, у баях удзельнічае каля 120 тысяч японцаў і каля 180 тысяч кітайцаў. Японскія войскі прабуюць зламіць супраціўленне кітайцаў і ачысціць увесь раён гор Чжунцяошань, каб выйсці на паўночны бераг ракі Хуанхэ і аўладаць наяўнымі ў гэтым месцы пераправамі праз раку. Гэту задачу ўдалося ажыццявіць толькі адной японскай калоне, якая, хоць і дасягнула берага Хуанхэ, але не змагла прыступіць да форсіравання ракі, бо яе сілы значна аслаблі ў цяжкіх баях. Яна вымушана была зноў павярнуць на поўнач, каб забяспечыць безапасны свайго тыла. Кітайскія войскі прадаўжаюць аказваць супраціўленне ў горных раёнах, не даючы японцам сканцэнтраваць свае сілы па якім-небудзь адным участку фронта.

Баі ў правінцыі Чжэцзян, на поўдзень ад станцыі Чжуцзі, на Чжэцзян-Цзянсійскай чыгунцы, прынялі зацяжны характар. Японскім войскам у першыя дні мінулага тыдня ўдалося зламіць супраціўленне кітайцаў і перайсці ў наступленне. Аднак неўзабаве кітайскія войскі, прыпыніўшы наступленне праціўніка, перайшлі ў контрнаступленне. Раніцой 20 мая кітайцы падышлі ўжо да Чжуцзі і к вечару таго-ж дня аўладалі горадам. Японскія войскі адступілі на поўнач, а кітайцы ўмацаваліся на пазіцыях у ўзгорыстых раёнах у ваколіцах горада.

За апошнія дні баі ўзмацніліся таксама ў правінцыі Фуцзянь. Кітайскія войскі, якія аказваюць супраціўленне японцам на захад і паўночны захад ад Фучжоу, адцяснілі японцаў да горада. Баі ідуць у ваколіцах горада.

На поўначы правінцыі Хубэй упорныя баі ідуць у раёне Суйсянь-Цзаоян. За мінулы тыдзень горад Цзаоян не раз пераходзіў з рук у рукі і зноў занят кітайцамі. Японскія войскі вымушаны былі адступіць у напрамку на Хуантанчэн.

У паўднёвым Кітаі баі прадаўжаюцца ва ўсходняй частцы правінцыі Гуандун у раёне Боло-Вэйчжоу.

23 мая. (ТАСС).

ГЕРМАНІЯ ПАТРАБУЕ АДКЛІКАННЯ АМЕРЫКАНСКІХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ ПРАДСТАЎНІКОЎ З ПАРЫЖА

ПЬЮ-ЙОРК, 21 мая. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс з Вішы, у аўтарытэтных кругах паведамляюць, што Германія патрэбавала ад ЗША адклікання ўсіх дыпламатычных прадстаўнікоў з Парыжа да 10 чэрвеня.

ВАШЫНГТОН, 23 мая. (ТАСС). На пытанні прадстаўнікоў друку дзяржаўны сакратар ЗША Хэл адказаў, што, па яго думцы, патрабаванне Германіі адклікаць дыпламатычныя прадстаўніцтвы з Парыжа не пашыраецца на консульскіх прадстаўнікоў. Зараз у Парыжы 7 амерыканскіх консульскіх работнікаў.

Агенцтва Юнайтэд Прэс сцвярджае, што калі Германія патрэбуе адклікання з Парыжа консульскіх прадстаўнікоў, то ЗША, магчыма, прадпрымуць адказныя меры.

АД'ЕЗД АНГЛІЧАН І АМЕРЫКАНЦАЎ З БЕЙРУТА

НЬЮ-ЙОРК, 23 мая. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англійскі консул у Бейруце выехаў у Палесціну. Перад ад'ездам ён звярнуўся да амерыканскага консула з просьбай прадстаўляць у Бейруце англійскія інтарэсы. Звыш 100 англічан і амерыканцаў, у тым ліку выкладчыкі і студэнты амерыканскага універсітэта, выехалі з Бейрута ў Палесціну.

ПЕСНЯ ПРА БАЛОТЫ

Тэкст П. Броўні *Муз. І. Любана*



I.

На багне, на імшарах
Нахмураныя лозы.
Не пройдзеш, не праедзеш,
Вакол адна жуда.
Балоты — нашы слёзы,
Балоты — наша гора,
Балоты — наша даўняя
бяда.

Прыпеў:

Сягоння перад намі
Адказны час.
Прышоў ад бацькі Сталіна
Для нас наказ:
Высушыць балоты
Ў пятнаццаць год.
Выходзь-жа на работу,
Выходзь-жа ўвесь народ!

II.

Мы станем грамадою
За працаю руплівай.
Разыйдуцца каналы
І скажа чалавек:
Балоты — нашы нівы,
Балоты — нашы пожні,
Балоты — наша скарбніца
навек!

(Прыпеў).

III.

Прасторы зарунеюць
Прыгожым аксамітам.
Мы пройдзем і праедзем,
Пабачым з краю ў край.
Балоты — наша жыта,
Балоты нашы травы,
Балоты — большэвіцкі
ўраджай!

(Прыпеў).

ПРЫКЛАДНЫЯ ПАЖАРНЫЯ

Нядаўна ў гарадскім пасёлку Лагойск узнік пажар. Загарэўся дом. Агонь хутка распаўсюдзіўся і пагражаў суседнім будынкам. Дзякуючы выключнай энергіі байцоў і малодшых камандзіраў мясцовай пажарнай каманды пажар быў хутка ліквідаван. Пры тушэнні пажару асабліва адзначыліся камандзір аддзялення пажарнай аховы Адамовіч, баец Галдовіч і шофер Шымановіч. Гэта не адзінкавы выпадак, калі асабовы састаў Лагойскай пажарнай каманды паказвае выключныя ўзоры самаадданай работы.

Вось другі выпадак. 5 мая г. г., у 2 гадзіны ночы, узнік пажар у цырульні, размешчанай у будынку Астрашыцка-Гарадзецкага сельпо, Мінскага раёна. Першым заўважыў пажар брыгадзір калгаса імені Сталіна тав. Жук, які неадкладна выклікаў добраахвотную пажарную дружыну. Начальнік дружыны тав. Лявіцкі ўмела арганізаваў тушэнне пажару і паказаў асабісты прыклад. Пры гэтым паказалі сябе: брыгадзір калгаса тав. Жук, настаўнік Астрашыцка-Гарадзецкай школы тав. Цярэшчанка, фінработнік тав. Міхалевіч і рабочы лесазавода тав. Раскін.

Загадам УНКВД па Мінскай вобласці ўсім удзельнікам тушэння памянёных пажараў аб'яўлена падзяка, а тыя, хто асабліва адзначыўся, апрача таго, прэміраваны грашыма.

Ф. КАБЕРНІК.

Мастацкая выстаўка ў Гомелі

ГОМЕЛЬ. **(Спец. кар. «Звязды»).** Пры Доме народнай творчасці адкрылася выстаўка работ мастакоў Гомельскай вобласці. Экспаніруюцца 182 работы. Прыемнае ўражанне пакідае адзел творчасці самадзейных мастакоў. Тут можна ўбачыць карціны, выкананыя маслам, акварэллю, мастацкую вышыўку, скульптуру, інкрустацыю. Цікавасць прадстаўляе карціна «Допыт большэвіка», выкананая работніцай гомельската дэпо Е. А. Ганчаровай, і эскіз яе на тэму «Першы дзіцячы сад у Заходняй Беларусі». Майстэрска зроблена з гліны скульптура Джамбула — работы школьніка Робермана. На выстаўцы паказаны акварэльныя малюнкі пенсіянера В. П. Аксамітава, тэматыка якіх вельмі рознастайная. Ён адлюстраваў і такую актуальную тэму, як засушка балот.

Выстаўка карыстаецца вялікай папулярнасцю. Тут пабывала ўжо каля 3,5 тысячы чалавек. Пасля закрыцця выстаўкі, у пачатку чэрвеня адбудзецца творчая канферэнцыя ўдзельнікаў яе сумесна з прадстаўнікамі грамадскасці горада.

Вечары беларускай літаратуры

БЕЛАСТОК, 23 мая. **(Кар. «Звязды»).** Вялікі маладзёжны літаратурны вечар, прысвечаны творчасці Максіма Танка, нядаўна адбыўся ў Беластоку. На вечары сабралася каля 800 чалавек. Пасля даклада Максім Танк чытаў свае вершы.

Па прыкладу Беластока, вечары беларускай літаратуры праводзяць многія райкомы комсамола вобласці. У бліжэйшыя дні адбудзецца такі вечар у Ломжы, у ім прымуць удзел пісьменнікі Філіп Пестрак і Максім Танк. У Саколках адбудзецца вечар, прысвечаны творчасці беларускага народнага паэта, лаўрэата Сталінскай прэміі Янкі Купалы.

Чырвонаармейскі драматычны калектыў

Вялікай папулярнасцю сярод байцоў і камандзіраў Н-скай часці карыстаецца чырвонаармейскі драматычны калектыў. У сакавіку ён паставіў п'есу «Неба і пекла» Праспера Мерымэ. Нядаўна калектыў паказаў сваю новую работу — пастаноўку п'есы «Платон Крэчэт» А. Карнейчука. Ролю Платона Крэчэта выконвае сержант Ардэлян, ролю Берэста —чырвонаармеец Пісараў, ролю Бубліка — чырвонаармеец Штыраеў. Актыўны ўдзел у спектаклі прынялі жонкі компачсастава. Тав. Дарашова іграла Бачкарову, тав. Рывенка — Ліду, тав. Бірук — маці Платона Крэчэта. Ролю Хрысціны Архіпаўны выканала тав. Меркушава, Маі Берэст — Аля Семелюкова.

Зараз чырвонаармейскі драмкалектыў пачынае працаваць над п'есай «Вочная стаўка».

Адказны рэдактар М. К. АСТАПЕНКА.

Дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета БССР

24 мая
РУСАЛКА
Пачатак у 8 г. веч.

Першы беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр

24 мая — Прэм'ера
К. Чорны.
У АПОШНЮЮ НОЧ
(Ірынка)
Пачатак у 8 г. веч.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ

КАНЦЭРТНЫ ЗАЛ
(рог вуліц Урыцкага і К. Маркса, 21/13).
26 мая
закрыццё зімняга сезона
АРАТОРЫЯ для салістаў хора і сімфанічнага аркестра
ЕМЕЛЬЯН ПУГАЧОЎ
муз. М. Каваля
Салісты: К. Ф. Сімага (бас), О. Н. Фурс (меццо-сапрана), Е. І. Герашчанка (сапрана).
Галоўны хормейстар — І. Г. Бары. Дырыжор — заслуж. арт. БССР І. А. Мусін. Уступнае слова А. В. Карповіч.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Цана білетаў — ад 2 да 8 руб.
Білеты ў касе канцэртнага зала, з 12 да 2 і з 5 да 9 гадзін вечара.

ДЗЯРЖЦЫРК
(Парк ім. Горкага, тэл. 22-725)
СЁННЯ ВЯЛІКАЕ ЦЫРКАВОЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ
Ў трох аддзяленнях.
У праграме—усе віды цыркавога мастацтва.
Каса цырка адкрыта з 12 гадзін дня.
Пачатак у 8 г. 30 м. веч.
Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы.

25 мая
Вялікае даённае цыркавое прадстаўленне
Пачатак у 2 гадзіны дня.
Каса адкрыта з 10 г. раніцы.

Памяшканне Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ПОЛЬСКАГА ТЭАТРА БССР
24 мая—прэм'ера
В. Вішнеўскі
АПТЫМІСТЫЧНАЯ ТРАГЕДЫЯ
Пастаноўка мастацкага кіраўніка тэатра А. Венгерка.
Пачатак у 8 гадзін вечара.
Каса адкрыта з 1—3 і з 5—9 г. веч. Па калектыўных заяўках прадстаўляецца скідка.

Сёння ў кінатэатрах

Кінатэатр «Чырвоная зорка»
ГРУНЯ КАРНАКОВА

Кінатэатр «Родина»
ТАЯМНІЧЫ ВОСТРАЎ

Кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ

Кінатэатр „РОДИНА"
48.000 гледачоў праглядзелі за 12 дзён
МАСТАЦКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ
ТАЯМНІЧЫ ВОСТРАЎ
З прычыны каласальнага поспеху прадаўжаецца дэманстраванне кінофільма
ТАЯМНІЧЫ ВОСТРАЎ
СЁННЯ, 24 мая, АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА ФАЙЗ
На эстрадзе — КАНЦЭРТНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ ЛЕНІНГРАДСКАГА ДЖАЗ-АРКЕСТРА
пад кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка С. Н. ЮЗЕФОВІЧА
пры ўдзеле салістаў Л. ЧЭРНІНАЙ (спевы), К. А. ПЕТРОЎСКАГА (юмар), АКІМАВАЙ і ЛАУРЫІ (ба лет).
Пачатак сеансаў у 6, 7.45, 9.15 і 11 г. веч.
Пачатак канцэртаў за 30 мінут да пачатку сеанса.
Каса адкрыта з 1 гадзіны дня.

ЛЕНІНГРАДСКІ ХІМІКА-ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ МАЛОЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ
аб'яўляе прыём студэнтаў
НА 1941/42 ВУЧЭБНЫ ГОД.
НА ВОЧНАЕ І ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННІ.
Інстытут рыхтуе інжынераў-тэхнолагаў малочнай прамысловасці. Тэрмін навучання — пяць год. Скончыўшыя інстытут інжынеры займаюць на вытворчасці наступныя пасады: зменнага інжынера, загадчыка лабараторыі, начальніка цэха, тэхнарука прадпрыемства, намесніка галоўнага інжынера прадпрыемства
Усе паступаючыя падвяргаюцца прыёмным іспытам па матэматыцы, фізіцы, хіміі, рускай мове і літаратуры і замежнай мове.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ — ДА 1 ЖНІЎНЯ. ПРЫЁМНЫЯ ІСПЫТЫ — З 1 ПА 20 ЖНІЎНЯ.
З 1 ліпеня для паступаючых у інстытут арганізуецца кансультацыя.
Усе прынятыя ў інстытут забяспечваюцца інтэрнатам (без сямі). Стыпендыя — на агульных падставах.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: Ленинград, Пушкин, Комсомольская № 10, Ленинградский Химико-технологический институт молочной промышленности, приемной комиссии.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Дзіцячы кінатэатр
Дзённыя сеансы
1. «В КУКОЛЬНОЙ СТРАНЕ»
2. СТАРЫ ДВОР
Вячэрнія сеансы для дарослых
ВЯЛІКІ ВАЛЬС

Кінатэатр «Спартак» («Навіны дня»)
1. Наша Масква
2. Саюзкінажурнал № 42

ПРАВОДЗІЦЦА НАБОР
У НАСТУПНЫЯ ВАЕННА-МАРСКІЯ ВУЧЫЛІШЧЫ ВМФ.
ВЫШЭЙШАЕ ВАЕННА-МАРСКОЕ ОРДЭНА ЛЕНІНА ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЕ ВУЧЫЛІШЧА імені М. В. ФРУНЗЕ (Ленинград, В. О., наб. лейтенанта Шмидта, 17).
ЧОРНАМОРСКАЕ ВЫШЭЙШАЕ ВАЕННА-МАРСКОЕ ВУЧЫЛІШЧА (г. Севастополь, почтовый ящик 147).
КАСПІЙСКАЕ ВЫШЭЙШАЕ ВАЕННА-МАРСКОЕ ВУЧЫЛІШЧА (г. Баку, Зых. почтовый ящик № 264).
Пералічаныя вучылішчы рыхтуюць страявы начальствуючых саставу Ваенна-Марскога Флота. Тэрмін навучання 4 годы.
ВАЕННА-МАРСКОЕ ВУЧЫЛІШЧА АБАРОНЫ імені ЛКСМУ (Севастополь, Корабельная сторона). Рыхтуе камандзіраў берагавой абароны ВМФ. Тэрмін навучання 3 годы.
ВАЕННА-МАРСКОЕ МЕДЫЦЫНСКАЕ ВУЧЫЛІШЧА ВМФ (г. Кронштадт). Рыхтуе сярэдні медыцынскі персанал для караблёў і часцей ВМФ. Тэрмін навучання 2 годы.
ВАЕННА-МАРСКОЕ ГАСПАДАРЧАЕ ВУЧЫЛІШЧА ВМФ (г. Выборг, п/я 72). Рыхтуе адміністратыўна-гаспадарчы састаў ВМФ. Тэрмін навучання 2 годы.
У вучылішчы прымаюцца грамадзяне Саюза ССР мужчынскага полу ва ўзросце ад 17 да 22 год, маючыя сярэднюю адукацыю.
Прыём заяў праводзіцца па 1 ліпеня 1941 года.
Падрабязныя правілы прыёму высылаюцца вучылішчамі па запытанню.
УПРАЎЛЕННЕ ВАЕННА-МАРСКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ.

МАСКОЎСКІ ПЛАНАВЫ ІНСТЫТУТ
ВЕВШ пры СНК СССР
АБ'ЯЎЛЯЕ НА 1941/42 ВУЧЭБНЫ ГОД.
прыём студэнтаў і аспірантаў
НА ПЕРШЫ КУРС ІНСТЫТУТА
ПА ВОЧНАМУ, ДЗЁННАМУ, ВЯЧЭРНЯМУ І ЗАВОЧНАМУ аддзяленням.
ІНСТЫТУТ РЫХТУЕ:
ЭКАНАМІСТАЎ ПА ПЛАНІРАВАННЮ ПРАМЫСЛОВАСЦІ;
ЭКАНАМІСТАЎ ПА ПЛАНІРАВАННЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ;
ЭКАНАМІСТАЎ ПА ПЛАНІРАВАННЮ ФІНАНСАЎ.
ЭКАНАМІСТАЎ ПА ПЛАНІРАВАННЮ ТАВАРААБАРОТУ.
Тэрмін навучання — 4 годы, па завочнаму аддзяленню — 5 год.
Прыём заяў — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня, па завочнаму аддзяленню — да 31 жніўня.
Прыёмныя іспыты — з 1 па 20 жніўня, па завочнаму аддзяленню — па 20 верасня.
Аспіранты прымаюцца па кафедрах:
палітычнай эканоміі, народнагаспадарчага планіравання эканомікі прамысловасці, эканомікі сельскай гаспадаркі, фінансавага крэдыта.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 15 ЖНІЎНЯ.
Іспыты для аспірантаў — па асновах марксізма-ленінізма, палітычнай эканоміі, спецыяльнаму прадмету і замежнай мове.
Прынятыя ў аспірантуру залічаюцца на стыпендыю і забяспечваюцца інтэрнатам, без сямі.
Адрас інстытута: Москва 46, Спартаковская ул., д. 2-а. Трамваі: 3, 6, 12, 21, 24, 28, 30. Тэлефон Е-1-72-64.
Заочнага аддзялення: Москва, 110, 2-я Мещанская ул., д. 39. Тэлефон И-1-70-80, трамваі: 10, 4, 32, 45, 12, Б, 30.

РАДЫЁПРАГРАМЫ

26 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

Ст. РВ-10

00.07—Эстрадны канцэрт. 10.00—Перадача для зучняў рамесленых вучылішч і школ ФЗА. Фанвізін — «Недарасль». 17.00—Перадача для піонераў і ст. школьнікаў. Вольскі «Белавежская пушча». 18.00—Літаратурная перадача: «М. Ю. Лермантаў». 18.15—Канцэрт з твораў Верстоўскага, Гурылёва, Аляб'ева і Варламава. 19.30—Песні народаў СССР. 20.00—Мантаж п'есы лаўрэата Сталінскай прэміі Карнейчука: «У стэпах Украіны». 21.35—Канцэрт з твораў Гайдна і Моцарта.

Ст. РВ-95

9.30—Песні і маршы совецкіх кампазітараў. 17.30—Канцэрт. Фортэпіянныя мініяцюры Шуберта і Шумана. 18.15—Пазастудыйная перадача: «На асушаных балотах». 18.30—Беларускія народныя песні. 21.05—Літаратурная перадача на яўр. мове. Дзегцяр — «Помнік». 21.40—Папулярны канцэрт.

27 МАЯ, АЎТОРАК

Ст. РВ-10

00.07—1. Літаратурная перадача. Апавяданні Мопасана. 2. Балетная музыка. 10.00—Перадача для дзяцей з цыкла «Жыццё школы». 10.10—Перадача для дашкольнікаў. Якуб Колас — «Па ягады». 11.00—Лекцыя з цыкла «Усеагульная гісторыя»: «Утварэнне рабаўладальніцкіх дзяржаў у Грэцыі». 17.00—Перадача для піонераў і ст. школьнікаў. Грыгор'еў — «Сілач». 17.45—Літаратурная перадача. Н. Шпанаў—«Знішчальнікі». 18.15—Песні і маршы совецкіх кампазітараў. 19.30—Урыўкі з оп. Дэліба «Лакмэ». 20.15—Лекцыя ў дапамогу зывучаючым гісторыю Совецкай Беларусі: «БССР у перыяд пераходу на мірную работу па аднаўленню народнай гаспадаркі». 21.05—Канцэрт. 22.00—Эстрадна-танцавальны канцэрт.

Ст. РВ-95

17.30—Гутарка на польскай мове: «Герої Арктыкі». 18.15—Канцэрт у выкананні Чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і танца Саюза ССР».

28 МАЯ, СЕРАДА

Ст. РВ-10

00.07—Вечар венскага вальса. 17.00—Перадача для мал. школьнікаў. Пісаржаўскі — «Ваенныя тайны». 18.00—Літаратурная перадача — «Іван Франко». 18.15—Беларускія народныя песні ў выкананні цымбальнага аркестра Белдзяржфілармоніі. 19.30—Канцэрт абаронай музыкі. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: «Аб кнізе В. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыокрытыцызм». (Лекцыя 2-я). 21.05—Мантаж оперы Гуно «Фаўст». 22.20—Літаратурная перадача. Якуб Колас—«На прасторах жыцця». 22.50—Эстрадны канцэрт.

Ст. РВ-95

17.30—Перадача для дзяцей на яўр. мове з цыкла «Жыццё школы». 18.15—Перадача: «Работа пастаянных камісій Баранавіцкага Выканкома горсовета». 18.30—Канцэрт. Урыўкі з опер кампазітараў брацкіх рэспублік.

29 МАЯ, ЧАЦВЕР

Ст. РВ-10

00.07—1. Літаратурная перадача. Апавяданні Чэхава. 2. Папулярны канцэрт. 10.00—Перадача для мал. школьнікаў. Аксакаў — «Аленький цветочек». 11.00—Лекцыя з цыкла «Гісторыя СССР»: «Царская Расія ў імперыялістычнай вайне»; «Другая буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя». 17.00—Канцэрт для дзяцей з твораў беларускіх кампазітараў. 17.45—Літаратурная перадача. Гуцульскія народныя казкі. 18.15—Папулярны канцэрт. 19.30—Артыкул: «Папаінскія і лунінскія метады работы на чыгунках БССР». 19.45—Перадача для калгаснікаў. 20.00—Канцэрт.

Ст. РВ-95

17.30—Перадача на польскай мове. Навукова-папулярныя гутаркі «Што такое неба?» і «Колькі год зямлі». 18.15—Канцэрт. Урыўкі з опер беларускіх кампазітараў. 22.00—Літ. муз. перадача на польскай мове — «Іван Франко».

БЕЛКАНТОРЫ «СОЮЗРАСТКАУЧУК»
ПАТРЭБНЫ
для работы ў Мінску:
НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА БУХГАЛТАРА, БУХГАЛТАР-РЕВІЗОР І РАХУНКАВОД;
для работы ў раёнах БССР:
АГРАНОМЫ — ЗАГ. ПУНКТАМІ, БУХГАЛТАРЫ, ЛАБАРАНТЫ.
Звяртацца па адрасу: Мінск, 2, Люксембургскі завулак, 10, Белканторы «Союзрасткаучук».

МІНОБЛМНОГАПРОМСАЮЗУ
ПАТРАБУЮЦЦА:
БУХГАЛТАР-РЭВІЗОР, СТАРШЫ БУХГАЛТАР-КАСІР для работы ў апараце і ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ для работы ў арцелях.
Звяртацца па адрасу: Мінск, вул. Крапоткіна, 58-а. Тэл. 25-991.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны: адказны рэдактар — 2-09-00 (камутатар): дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара 2-51-88, адказны сакратар—2-24-12, намеснік адказнага сакратара — 2-13-53, сакратарыят — 2-08-30. Аддзелаў: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-39-55, сельгасгрупа—2-13-99, пакой літработнікаў—2-13-60, аддзел рабселькораў і тсем працоўных — 2-13-85, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтарыя выдавецтва і аддзел аб'яў — 2-08-44, выпускаючы—2-47-68, карэктарская— 2-13-57.

У2285. Друкарня газеты «Звязда». М., Д., Ш.